Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 ЧЭРВЕНЯ 2021 г. СУБОТА

№ 115 (29484)

ПАЧЫМ КЛУБНІЦЫ Ў ДВАРЦЫ 3

ТАЯМНІЧЫ КОД АЛЕНЫ ПАПОВАЙ 6

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Павінна быць дакладная сістэма, патрабавальнасць да людзей»

Новыя кіраўнікі мясцовай вертыкалі, дыпламатычных прадстаўніцтваў і прадпрыемства — кадравы дзень у Палацы Незалежнасці

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прызначыў Валерыя Рабкаўца старшынёй Пінскага гарадскога выканкама, Валянціна Зайчука — першым намеснікам Брэсцкага абласнога выканкама, Сяргея Карпенку — старшынёй Баранавіцкага раённага выканкама, Мікалая Арлова — старшынёй Віцебскага гарадскога выканкама, Андрэя Санько — старшынёй Мастоўскага раённага выканкама, Міхаіла Гулага — старшынёй Горацкага раённага выканкама, Галіну Слабодніка-ву — старшынёй Кіраўскага раённага выканкама, Рамана Мельніка — кіраўніком адміністрацыі Ленінскага раёна горада Мінска. Сяргей Літаш зацверджаны Прэзідэнтам на пасаду генеральнага дырэктара гандлёва-вытворчага РУП «Белфармацыя».

«Часы заўсёды былі няпростыя, асабліва для вас, таму што вы заступаеце на перадавую лінію і вам сам-насам прыйдзецца працаваць з нашым насельніцтвам», — пачаў размову з новымі кіраўнікамі Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт паўтарыў параду, якую на гэтым тыдні даў старшыні Аршанскага райвыканкама. «Ні ў якім разе не спяшайцеся. Заўсёды давайце людзям шанц. Прыйдзіце ў калектыў, прызначце тэрмін, дайце магчымасці ўсім, хто хоча працаваць. Можа, хтосьці не хацеў, а захоча працаваць. Не сячыце з-за пляча, але і не адкладайце на доўгі час рашэнне пытанняў. Няхай сябе пакажуць да канца года, а далей прымайце рашэнне», — сказаў Прэзідэнт.

Яшчэ адна парада кіраўнікам мясцовай улады — не «перацягваць» на новае месца былых калег. «Па-першае, і там людзі неабходныя. Не трэба іх перацягваць і разлічваць толькі на асабістую ад-данасць і сяброўства. Усё ж такі павінны быць яны і прафесіяналамі, і людзьмі, адданымі нашай дзяржаве. Мінулы год паказаў, хто ёсць хто і ў якім кірунку выбудоўваць кадравую палітыку», — дадаў кіраўнік краіны.

Новыя кадры ідуць працаваць у сельскагаспадарчыя раёны, таму асаблівую ўвагу, Прэзідэнт падкрэслівае, неабходна ўдзяліць выканаўчай дысцыпліне.

На яго думку, неабходна прыстасоўвацца да патэнцыялу кадраў, што ёсць на месцы, а не скардзіцца на іх недахоп. Прэзідэнт даў даручэнне сфарміраваць каманды, напрыклад, тых жа ветурачоў у раёнах пры ўпраўленнях сельскай гаспадаркі ці пры ветстанцыях. Ён нагадаў і пра патэнцыял кадраў, якіх накіроўваюць вучыцца па мэтавых заяўках у ВНУ.

«І звярніце асноўную ўвагу на гаспадаркі, якія сёння слабенькія. Іх у раёнах з 12—15 тры-чатыры — не болей. Астатнія нармальна працуюць і не ставяць пытанні па спецыялістах: ветурачах, заатэхніках ці аграномах, а вось на тры-чатыры гаспадаркі зрабіце ўпор», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што ў канцы года праверыць, як ідуць справы з такімі адсталымі гаспадаркамі.

Па яго словах, на ўласным вопыце ён зразумеў, што не хапае ў АПК менавіта дысцыпліны, ды дрэнна працуюць і над захаванем тэхнікі.

«Гэта таму, што многім яна бясплатна дастаецца. «Грошы далі, давай сто камбайнаў закупім», — кажуць. Праз два гады на гэты камбайн жахлівa глядзець. А каштуе ён нямала — і 300 тысяч долараў, і 500 тысяч долараў. Гэта велізарныя грошы для сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і для краіны. Таму дысцыпліна і яшчэ раз дысцыпліна», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён дадаў, што не трэба спадзявацца на рыначную эканоміку. «Рынак нічога не адрэгулюе за чвэрць стагоддзя. Я за гэтым уважліва назіраю, — нагадвае кіраўнік краіны. — Таму неабходна дысцыпліна. У нас няма шалёных грошай. Калі мы спім, у нас нафтавая ці газавая труба не працуе і грошы не капаюць на рахунку. Нам неабходна сваімі рукамі ўсё рабіць».

«Павінна быць дакладная сістэма, патрабавальнасць да людзей. Людзі павінны ведаць, што рабіць, а вы кантралюйце. Калі трымаеш пад кантролем — пытанні вырашаюцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Асаблівыя спадзяванні Прэзідэнт выказаў на працу Рамана Мельніка, прызначанага кіраўніком Адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска. СТАР. 2

Прафесіяналізм і бязмежная міласэрнасць



Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваў віншаванне работнікам аховы здароўя з прафесійным святам — Днём медыцынскага работніка.

«Мы шчыра ганарымся нашымі медыкамі, якія спаўна надзелены самымі важнымі для гэтай прафесіі якасцямі: высокай кампетэнтнасцю і бязмежнай міласэрнасцю», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы адрасаваў словы ўдзячнасці за самаадданую працу ўрачам, медыцынскім сёстрам, фельчарам, малодшаму медперсаналу, спецыялістам лабараторнай дыягностыкі і санітарна-эпідэміялагічнай службы, вучоным, фармацэўтам, правізарам.

«Вы крыласутачна знаходзіцеся на варце здароўя і жыцця суайчыннікаў. Вам даводзіць дзясяткі тысяч замежных пацыентаў, якія выбіраюць для дыягностыкі, лячэння і рэабілітацыі менавіта Беларусь, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Упэўнены: пераемнасць пакаленняў, захаванне высакародных традыцый айчыннай медыцыны і ваша пастаяннае імкненне да самаўдасканалення дапамогуць далейшаму развіццю аховы здароўя Беларусі».

Прэзідэнт пажадаў работнікам аховы здароўя прафесійных поспехаў, вялікага асабістага шчасця і моцнага здароўя. «Няхай заўсёды побач будуць надзейныя і дарагія вам людзі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Урач агульнай практыкі Аксана БЫЛІЦКАЯ ўжо пятнаццаць гадоў узначальвае Чырвонабярэжскую сельскую ўчастковую бальніцу — пасля заканчэння Мінскага медыцынскага ўніверсітэта і ардынатуры яе адразу прызначылі на гэтую адказную пасаду, і невыпадкова: медыцынскае падраздзяленне Жлобінскай цэнтральнай раённай бальніцы на працягу апошніх гадоў лічыцца адным з паспяховых. У структуры бальніцы дзейнічае і амбулаторыя, якая абслугоўвае сямнаццаць населеных пунктаў, а гэта болей за тры тысячы чалавек. У падпарадкаванні загадчыцы Быліцкай працуе 27 чалавек медперсаналу — усе яны людзі адданыя абранай прафесіі і, галоўнае, з вялікім працоўным вопытам. У гэтыя дні чырвонабярэжскія медыкі займаюцца вакцынацыяй сваіх землякоў.

На фота (*злева направа*): Аксана БЫЛІЦКАЯ, загадчыца здраўпункта чырвонабярэжскага каледжа Зінаіда ФРАЛЯНКОВА, медыцынскія сёстры Ларыса КАСТЭНКА, Вольга ЦЕЛЬБУКОВА.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

З нагоды

НАЙЛЕПШАЯ ЎЗНАГАРОДА — АДЧУВАЦЬ, ШТО ТЫ ПАТРЭБНЫ

Таццяна РУДЗЬКО — пераможца сёлетняга рэспубліканскага конкурсу «Урач года» ў намінацыі «Урач-педыятр». 35 гадоў яна працуе ў Карэліцкай цэнтральнай раённай бальніцы. Яе першыя маленькія пацыенты ўжо даўно самі сталі бацькамі і прывялі да Таццяны Уладзіміраўны сваіх дзяцей. Урач і сама ўжо мае ўнукаў, але развіваць з любімай прафесіяй пакуль не можа. Напэўна, якраз такія людзі, як яна, якія знайшлі сваю справу і робяць яе з дня ў дзень, з году ў год, і складаюць аснову дабрабыту — сваёй сям'і, горада і краіны.

Нарадзілася Таццяна Рудзько ў вёсцы Вышкава ў Карэліцкім раёне. І першай у свайго сям'і вырашыла стаць урачом. Паступіла ў Гродзенскі медыцынскі інстытут. Пасля яго заканчэння пэўны час практыкавалася, атрымлівала першы вопыт у дзіцячым аддзяленні Навагрудскай бальніцы. З удзячнасцю згадвае свайго тамтэйшага настаўніка Георгія Конюха, які прыадкрыў ёй многія сакрэты прафесіі. А пасля вярнулася на малую радзіму, у Карэлічы. СТАР. 2

Кожны трэці

ЖЫВЫЯ І МЁРТВЫЯ

Вялікая Айчынная вайна зачапіла амаль кожную беларускую сям'ю

Саракавыя-ракавыя раскідалі па свеце людзей, разлучылі цэлыя сем'і, пакінулі дзяцей сіротамі. Вайна перакрэсліла чалавечыя лёсы, прыняла за людзей усе важныя рашэнні. З фотаздымкаў, змешчаных у часовай экспазіцыі «Сорак першы: вобразы вайны і міру», якая адкрылася ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, глядзяць маладыя пары, бацькі і дзеці, браты і сёстры. Яны пакуль не ведаюць, што вайна падзяліла іх на жывых і мёртвых...

Хімік Амнуіл і Агаф'я Барысенка (1941 год).

НЕ ДАЧАКАЛІСЯ МУЖОЎ...

Хімік Амнуіл і Агаф'я Барысенка пажаніліся да вайны. Ён — афіцэр, служыў у ваенным гарадку ў Мінску. За некалькі дзён да пачатку вайны (18 чэрвеня) яна нарадзіла сына. Хімік яшчэ паспеў забраць іх з радзільні і ў той жа дзень, 23 чэрвеня, сышоў на фронт. Агаф'ю, як і ўсіх жонак афіцэраў, з палаючага Мінска эвакуіравалі. Яна прыехала да сваіх бацькоў у вёску, часта наведвалася да родных мужа ў Чарнёўку, што ў Магілёўскай вобласці. СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэзідэнт ЗША падпісаў закон аб прызнанні Дня адмены рабства



Джо Байдэн падпісаў закон аб Нацыянальным дні адмены рабства. Такім чынам, 19 чэрвеня стала федэральным святам. Аб гэтым паведаміла NBC News. «Дзень адмены рабства нагадвае нам аб доўгай цяжкай ночы прыгнёту, адначасова пазначае сабой наступленне светлай раніцы», — сказаў Джо Байдэн, выступаючы са зваротам у Белым доме пасля падпісання закона. У гэты дзень 156 гадоў таму федэральныя войскі прыбылі ў Тэхас і вызвалілі апошніх рабоў. Пракламацыя, якая складаецца з двух указаў Аўраама Лінкальна аб вызваленні рабоў і выдадзеная падчас грамадзянскай вайны ў ЗША, была абвешчана менавіта 19 чэрвеня 1865-га. Раней гэтая дата адзначалася на ўзроўні штатаў усюды, акрамя Паўднёвай Дакоты. Гэта першае свята, адобранае Кангрэсам з 1983 года, калі была ўвекавечана памяць забітага лідара руху за грамадзянскія правы афраамерыканцаў Марціна Лютэра Кінга-малодшага.

Колькасць загінулых ад коўіду ў свеце перавысіла чатыры мільёны чалавек

Смяротнасць ад каранавіруса ў свеце пераадолела адзнаку ў чатыры мільёны чалавек, падлічыла агенцтва Reuters. Паводле яго звестак, колькасць загінулых ад COVID-19 дасягнула 2 млн чалавек праз год пасля пачатку пандэміі, а наступныя 2 млн былі зарэгістраваныя ўсяго за 166 дзён. Колькасць новых выпадкаў захворвання і смерцяў зменшылася ў такіх краінах, як ЗША і Вялікабрытанія, але некаторыя дзяржавы адчуваюць недахоп вакцын. Цяпер дэльта-варыянт каранавіруса, які выяўлены напрыканцы мінулага года ў Індыі, становіцца дамінуючым штамам ва ўсім свеце. На пяць найбуйнейшых краін па агульнай колькасці смерцяў — ЗША, Бразілія, Індыя, Расія і Мексіка — прыпадае каля паловы ўсіх смерцяў у свеце. Перу, Венгрыя, Боснія, Чэхія і Гібралтар маюць самыя высокія паказчыкі смяротнасці з папраўкай на колькасць насельніцтва.

У Францыі з-за навальніц дзясяткі тысяч кватэр засталіся без электрычнасці

Моцныя ліўні, навальніцы і вятры прывялі да адключэння электрычнасці ў больш чым 37 тысячах кватэр на паўднёвым захадзе і ў цэнтральнай частцы Францыі, паведаміла ТАСС. У шэрагу гарадоў дэпартамента Жырона вуліцы затопленыя вадой. У прыватнасці, у горадзе Трэс выйшла з берагоў рака Крэон. Мэрыі давялося эвакуіраваць з дамоў 160 жыхароў, якія правялі ноч у мясцовай спартыўнай зале. У шэрагу раёнаў за ноч выпала паўтарамесячная норма ападкаў, хуткасць ветру дасягала 27,7 м/с. У выніку разгулу стыхіі пацярпелі два чалавекі ў дэпартаменце Тарн: дрэва ўпала на аўтамабіль, у якім знаходзіліся жанчына і яе сын. Яны шпіталізаваны. У дэпартаменце Ар'еж павалены галінамі дрэва паранены адзін чалавек. У дэпартаменце Верхняя Гарона з-за патокаў вады прыйшлося спыніць рух транспарту па чатырох дарогах. Непагадзь у Францыі выклікана распаленым паветрам, якое трапіла ў краіну праз Іспанію з Афрыкі. Змяшаўшыся з больш халоднымі масамі, яно прывяло да навальніц і ліўняў. Да іх пачатку на ўсёй краіне тэмпература перавышала 30 градусаў.

КАРОТКА

- **Новы ангіёграф з'явіўся ў Магілёўскай абласной клінічнай бальніцы.**
- БелАЭС атрымала ядзернае паліва для першай перагрузкі.
- **«Тэатр Крылы Халопа» і «Грунт будучыні» ліквідаваныя ў Брэсце па патрабаванні пракуратуры.**
- Бюсты Быкаву і Барадуліну адкрылі ва Ушачах. Бюсты з'явіліся дзякуючы ахвяраванням прыхільнікаў беларускіх класікаў.

- **У праваслаўных храмах і кляштарах будуць маліцца аб міры на беларускай зямлі і адзінстве народа.**
- Маладзёжны інтэрнэт-чэлендж БРСМ «Народная зарадка» стартуе 21 чэрвеня.

Размова па сутнасці

ДЗЕНЬ, ЯКІ НАМ ВАРТА АДЗНАЧАЦЬ

Што значыць для беларусаў дата 17 верасня і чаму пра гэта трэба памятаць і ведаць

Сёлета мы ўпершыню ў гісторыі краіны будзем адзначаць Дзень народнага адзінства. Паводле адпаведнага ўказа кіраўніка дзяржавы, новае дзяржаўнае свята прыпадае на 17 верасня. Дата, якая знаёмая амаль кожнаму беларусу, прынамсі візуальна — яна прысутнічае на шыльдах вуліц многіх гарадоў і мястэчак на захадзе краіны. Дата, якая, як лічаць многія гісторыкі, па значнасці для нашага народа саступае толькі 3 ліпеня ды 9 мая. Дата, пра якую, выходзячы з такой значнасці, ведаем зусім няшмат.

Чаму 17 верасня для беларусаў — сапраўды Дзень адзінства? Якія варункі зусім нядаўняй — найноўшай — гісторыі на нашай зямлі даюць права і нагоду гаварыць, што гэта дата знакавая для беларусаў? Чаму яе спрабуюць палітызаваць і аспрэчыць нашы заходнія суседзі? Чаму так важна гаварыць сёння і аб гэтай даце, і аб уласнай гісторыі ўвогуле менавіта з беларускай пазіцыі? Аб гэтым падчас круглага стала ў рэдакцыі «Звязды» разважалі Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, кандыдат гістарычных навук, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Вадзім ЛАКІЗА, кандыдат гістарычных навук, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Сяргей ТРАЦЦЯК, кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела найноўшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН, Валянцін МАЗЕЦ, кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік аддзела найноўшай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН. СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

«Павінна быць дакладная сістэма...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Прыемнае прызначэнне, што чалавек з праваахоўных органаў здолее працаваць на кіруючую пасаду ў грамадзянскай сферы. Але цяжка сказаць, ваенная ці неваенная ў вас будзе работа. Кіраўнікоў Адміністрацыі Ленінскага раёна вам працы хопіць не меней, чым у міліцыі. Трэба паглядзець, як ваенны чалавек спрацуе на гэтай пасадзе», — сказаў кіраўнік краіны.

Што датычыцца «Белфармацыі», ён адзначыў: стаўку зрабілі на гэта прадпрыемства, таму неабходна там наводзіць парадак. Такі загад Прэзідэнт і даў Сяргею Літашу. «Займіцеся цэнаўтварэннем. І будзьце вельмі акуратныя, не думайце, што вас там чакалі. Вы прыйшлі збоку і ведаеце, як некаторыя на гэта паглядзяць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Рэмарку Прэзідэнт зрабіў наконт праблем Піншчыны, заўважыўшы, што яны нікуды не дзеліся і новаму кіраўніку Валерыю Рабкаўцу неабходна іх убачыць і вырашыць. «Пінск для нас вельмі важны горад. На асаблівым кантролі. Таму я на вас вельмі разлічваю», — адзначыў кіраўнік краіны.

«БУДЗЬЦЕ ВАРТЫЯ КРАІНЫ І БЕЛАРУСКАГА НАРОДА»

Наступная частка прызначэнняў — дыпламаты. Дзмітрый Кальцоў накіраваны Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Іран. Дзмітрый Гарэлік едзе на гэтую пасаду ў Манголію, а Валерый Бараноўскі Вільнюс мяняе на кубінскую Гавану.

«Я публічна вас хачу папрэзідэць. Вы людзі разумныя, вопытныя, з мазгамі. Вы маеце права мець свой пункт погляду. Але вы ведаеце, куды ідзяце. Вы прадстаўляеце краіну і Прэзідэнта там, куды вас сёння накіравалі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён мякрыце, што гэтыя дыпламаты безагаворачна падтрымліваюць палітыку, якую ажыццяўляе кіраўніцтва краіны.

«Калі не ці змянілася меркаванне, неабходна прыйсці і ціха, спакойна сказаць: «Я не магу». Каб не было здрады. Я гэта кажу, таму што былі ў нас паслы, якія паступалі пэўным чынам. Някай гэта і адзінкавыя выпадкі, але гэта непрымальна. Вы людзі больш чым ваенныя, бо ваенныя прыгонах, як і вы, але тут, у краіне. А вы на чужыну едзеце, таму, гледзячы на нас, людзі будуць там на месцы ў Манголіі, Іране, Кубе рабіць высновы пра нашу краіну. Будзьце вартыя краіны, перадусім, і беларускага народа», — сказаў кіраўнік краіны.

У рабочым парадку Прэзідэнт падпісаў узгодненні на прызначэнне: Дзмітрыя Баско — першым намеснікам старшыні КДК, Андрэя Лабовіча — намеснікам старшыні КДК, Андрэя Кавальчука — намеснікам старшыні ДМК, Дзмітрыя Емяльянава — генеральным консулам Беларусі ў Чунцыне (КНР), Таццяну Шэдко — начальнікам сакратарыята Савета Рэспублікі, Сяргея Навадворскага — галоўным інжынерам БЧ, Алега Шулякоўскага — членам Брэсцкага аблвыканкама, Аляксандра Астрэйку — членам Мінскага аблвыканкама, Таццяну Астрэйку і Рамана Бандарука — членамі Мінскага гарвыканкама.

Марыя ДАДАЛКА.

Не толькі прафесія, а лад жыцця

Учора прайшла сустрэча спікера верхняй палаты парламента Наталлі КАЧАНАВАЙ са студэнтамі медыцынскіх вышэйшых навучальных устаноў краіны

Іх візіт у Савет Рэспублікі адбыўся па ініцыятыве Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе, а дакладней, Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, спорце і турызме Маладзёжнага парламента.

Будучых медыцынскіх работнікаў напярэдадні іх прафесійнага свята шчыра вітала старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава. Яна падкрэсліла, што ў Беларусі ахова здароўя — дзяржаўны прыярытэт. Усіды накіроўваюцца значныя сродкі, бо ў нас сацыяльна арыентаваная дзяржава і галоўнае ў ёй — чалавек, клопат пра яго. Паводле слоў спікера, у нашай краіне створана выдатная сістэма медыцынскай дапамогі і лячэння: пачынаючы ад сельскіх ФАПаў і заканчваючы рэспубліканскімі навукова-практычнымі цэнтрамі, якіх у краіне 17.

Умацоўваецца матэрыяльна-тэхнічная база медустаноў, дзе выкарыстоўваюцца найноўшыя тэхналогіі і перадавы досвед. Больш за тое, Беларусь захавала інфекцыйныя бальніцы, санэпідслужбы, якіх у некаторых краінах проста няма. І такія падыходы даюць плён.

Размова ў асноўным праходзіла ў фармаце адкрытага дыялогу. Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла выключныя заслугі айчынных медыцынскіх работнікаў у барацьбе з пандэміяй. Яна таксама дала грунтоўныя адказы на тыя пытанні, якія хвалююць не толькі студэнтаў медыцынскіх ВНУ, але і маладых прадстаўнікоў усёй універсітэцкай супольнасці Беларусі.

Наталля Качанава таксама падзялілася думкамі наконт місіі доктара ў грамадстве. На яе погляд, медык — гэта нават не прафесія і не спецыяльнасць — гэта пакланнне, лад жыцця, бо, па-першае, трэба бязмерна любіць людзей. Па-другое, варта разумець, што з выбарам прафесіі ўрача ты вызначыў свой лёс у жыцці. І ўрач павінен вучыцца на працягу ўсяго жыцця, звярнула ўвагу Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі напрыканцы сустрэчы пажадала маладым медыкам поспехаў у вучобе, а таксама здароўя ўсім прысутным, іх родным, блізкім, сябрам.

Леанід ТУГАРЫН.

Калі мы адзіныя...

Міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ наведаў з рабочым візітам Маскву

Там адбыліся перагаворы ў пашыраным складзе з міністрам замежных спраў Расійскай Федэрацыі Сяргеем ЛАЎРОВЫМ. Разгледжаны шырокі спектр актуальных пытанняў двухбаковага парадку дня. Асаблівая ўвага ўдзелена кардынальцы дзеянняў на міжнародных пляцоўках. Пра гэта паведамляе прэс-служба беларускага МЗС.

Міністры пацвердзілі зацікаўленасць у развіцці інтэграцыйных працэсаў у Саюзнай дзяржаве, ЕАЭС, СНД, АДКБ. Абмеркавалі супрацоўніцтва ў ААН, АБСЕ, іншых міжнародных арганізацыях, выказалі намер і далей сумесна прасоўваць нацыянальныя інтарэсы Беларусі і Расіі.

«З улікам арганізаванай сканкампаніі супраць дзвюх краін узгоднены падыходы да далейшай сумеснай работы ў інфармацыйнай прасторы ў нацыянальных інтарэсах Беларусі і Расіі», — перадае прэс-служба МЗС.

Міністры пацвердзілі намер працягнуць дзейнасць па пастаянным зняцці абмежаванняў на перамяшчэнне грамадзян праз беларуска-расійскую граніцу і да адпаўлення транспартных стасункаў з улікам эпідэміялагічнага становішча.

«Абмеркавалі надзённае пытанне бесперашкоднага ўзаемнага перамяшчэння грамадзян нашых краін, для вырашэння якога ўжо шмат зроблена, — перадае словы Уладзіміра Макея БелТА. — Але неабходна рухацца далей, нарошчваючы інтэнсіўнасць авія- і чыгуначных стасункаў да аб'ёмаў, якія былі да пандэміі».

Узгоднены графік набліжэйшых кантактаў і мерапрыемстваў знешнепалітычных ведамстваў на розных узроўнях, уключаючы сумеснае пасяджэнне калегій двух міністэрстваў восеньню гэтага года.

Сяргей Лаўроў расказаў, ці закраналаса сітуацыя ў нашай краіне на сустрэчы прэзідэнтаў Расіі і США. «Так, на перагаворах закраналаса беларуская тэматыка, але не як індывідуальная тэма, а ў кантэксце канцэптуальных дыскусій, якія адбыліся паміж прэзідэнтамі, — паведаміў Сяргей Лаўроў. — Яны былі канцэптуальныя, але мелі вельмі канкрэтнае праламленне ў практычнай палітыцы. Маю на ўвазе наступнае: у кожнага народа, гэта прызнавалася, ёсць свая гісторыя, свая культура, свае традыцыі, свае каштоўнасці. І іх трэба, ну, калі не паважаць, то прымаць як данасць».

НАЙЛЕПШАЯ ЎЗНАГАРОДА — АДЧУВАЦЬ, ШТО ТЫ ПАТРЭБНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Хацела працаваць у дзіцячым аддзяленні ў стацыянары. Аднак у паліклініцы быў вольным трэці ўчастак, і я пайшла туды. Там мяне апякала вопытны ўрач Кацярына Ціханаўна Ушкевіч. Здаецца, было гэта зусім нядаўна, а цяпер ужо і самой прыйшоў час перадаваць вопыт, — усміхаецца Таццяна Уладзіміраўна. — Ці ёсць з кім падзяліцца? Канешне, нядаўна выйшла з дэкрэтнага адпачынку наша маладая доктар, з ёй і дзелімся.

Таццяна Рудзько падкрэслівае, што калектыў, у якім цяпер чатыры педыятры, дружны і працу тут дзяліць на сваю і чужую не прынята.

— Мы без праблем падмяняем адна адну, калі ёсць такая патрэба, выходзім на дзяжурства ці на іншы ўчастак замест калегі — з гэтым пытанняў ніколі няма.

Увогуле, работа ўчастковых урачоў-педыятраў у раёне крыху адрозніваецца ад абавязкаў іх калег у паліклініках вялікіх гарадоў. Гэта не

толькі прыём на сваім участку, дзе, дарэчы, калі 700 юных пацыентаў, у тым ліку каля чатырох дзясяткаў дзетак да года. Таццяна Уладзіміраўна курыруе дзве групы малых у санаторным садку. Гэта дзеткі, якія часта хваруюць і маюць патрэбу ў дадатковай падтрымцы здароўя. Прызначэнне працэдур, агляд — усё гэта штодзённы клопат доктара. Таксама сярод абавязкаў участковага педыятра — рэгулярныя дзяжурствы па экстранай дапамозе ў прыёмным пакоі раённай бальніцы ці стацыянарным дзіцячым аддзяленні. Ну і выезды ў населеныя пункты Карэліцкага раёна, дзе таксама жывуць юныя пацыенты. Падчас піку распаўсюджання каранавіруснай інфекцыі Таццяна Уладзіміраўна працавала ў кантактнай групе і выязджала да дзетак, якія хварэлі на COVID-19.

У любы час сутак урача могуць выклікаць у бальніцу. Але не гэта яна лічыць самым складаным у прафесіі.

— Мне няпроста назіраць, калі дзіця цяжка хварэе, доўга не папраўляецца, нягледзячы на тое, што ты зрабіў усё, што мог. Мы заўсёды ідзём насустрач бацькам, калі просяць адправіць на дадатковае абследаванне ў Гродна ці Мінск. Даводзіцца накіроўваць нашых самых маленькіх пацыентаў і ў сталічны РНПЦ «Маці і дзіця». Я не баюся, што хтосьці скажа, быццам я чагосьці не ведаю і таму адправіла дзіця ў горад. У рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтрах найлепшыя дыягнастычныя магчымасці, ёсць урачы, якія спецыялізуюцца на рэдкіх выпадках. Самае галоўнае, каб своечасова быў выстаўлены правільны дыягназ і малое папраўлялася, — кажа доктар.

Выпадкаў, калі і сама Таццяна Уладзіміраўна западозрыла небяспечную хваробу і тым самым выратавала жыццё, за 35 гадоў было шмат.

— Неяк прыехала на чарговы патранаж у адну з вёсак. Кажу маме: у вашага дзіцяці вялікі вылаг, вы ж сами бачыце. Яна адказвае, што ён любіць паесці, таму і жывот такі. Давялося настаяць на дадатковым абследаванні. Выявілі нефрабластому (вельмі злаякасная пухліна ныркі. — **«Зв.»**), праапераравалі, на шчасце, усё скончылася паспяхова. Наколькі я ведаю, хутка з дзіцяці будуць здымаць інваліднасць.

Разам з мужам Таццяна Уладзіміраўна выхавала дзвюх дачок. Малодшая, Надзея, прадоўжыла сямейную дынастыю медыкаў. Яна ўрач-гінеколаг.

— З дзяцінства Надзейка вырашыла, што будзе доктарам. Заўсёды казала: мама, так прыемна ісці з табой па вуліцы — усе вітаюцца, усе цябе паважаюць. Яшчэ калі вучылася ў школе, захапілася біялогіяй, заняла першае месца на рэспубліканскім этапе алімпіяды, і яе запрасілі вучыцца ў Ліцэй БДУ. Там ужо на алімпіядзе яна стала трэцяй і без экзаменаў магла паступаць у медуніверсітэт, — дзеліцца Таццяна Уладзіміраўна.

У доктара чацвёра ўнукаў: трое хлопцаў-школьнікаў і дзяўчынка Ксюша, якая сёлета стане першакласніцай.

— Люблю, калі да нас з мужам прыязджаюць дзеці і ўнукі. Вельмі радуюся, калі мне прывозяць малых на канікулы. Заўсёды стараюся ўзяць кагонебудзь з іх з сабой, калі летам працую ў вышэй дзіцячым лагеры «Вясёлка». Гэтым летам са мной паедзе Поля, ёй сёлета споўніў першы клас.

Блізкія прапануюць Таццяне Уладзіміраўне адпачыць ад працы, аднак яна не пагаджаецца:

— Ведаеце, я ні разу ў жыцці не пашкадавала, што стала дзіцячым урачом. Прыходзіш пасля перапынку ў дзіцячы садок, а малыя наперабой: «А дзе вы былі, мы па вам сумавалі!» Ідзеш па вуліцы і чуеш: «Мама, нашаму доктару пайшла!» Гэта, напэўна, самая лепшая ўзнагарода — адчуваць, што ты карысны і патрэбны. Дочкі часам кажуць: «Мама, хопіць працаваць, адпачні». А я адказваю: «Мае ўнукі ўжо падраслі, але мяне чакаюць іншыя дзеткі, і там я больш патрэбна».

Алена КРАВЕЦ.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «МОБИЛЬНОЕ ЛЕТО С BTB И VISA»

1. Настоящая Рекламная игра называется «**Мобильное лето с BTB и Visa**» (далее – Игра, Рекламная Игра), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – Правила) согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры платы.

В Правилах нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

Розыгрыш – розыгрыш призового фонда Рекламной игры, проходящий в установленную дату и время в соответствии с Правилами Рекламной игры.

Участник – физическое лицо, держатель карточки Visa, эмитированной ЗАО Банк BTB (Беларусь), которое выполнило требования, необходимые для участия в Рекламной игре.

Карточка – банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

2. Сведения об организаторе.

Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Яскрава», УНП 191548102, зарегистрировано 16 ноября 2011 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191548102 (далее – Организатор).

Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, оф. 902

Электронный адрес Организатора: visa@yaskrava.by.

3. Территория проведения Игры – Республика Беларусь.

4. Период проведения Игры – с 20.06.2021 по 28.09.2021 (включительно), включая период вручения выигрышей и опубликования результатов проведения Игры.

5. Состав комиссии по проведению Игры.

Члены комиссии:

Жуковская Алла Анатольевна – главный специалист ЗАО Банк BTB (Беларусь);

Борисёнок Анастасия Алексеевна – главный специалист ЗАО Банк BTB (Беларусь);

Богдусевич Ирина Сергеевна – ведущий специалист ООО «Яскрава»;

Бельская Анна Николаевна – ведущий специалист ООО «Яскрава»;

Павлюшик Инна Викторовна – индивидуальный предприниматель.

6. Игра проводится в целях стимулирования безналичных расчетов (далее – безналичные операции) физическими лицами с использованием банковских платежных карточек международной платежной системы Visa, эмитированных ЗАО Банк BTB (Беларусь) (далее – Банк), в том числе Виртуальных карточек (эмитированных без использования материального носителя), с любой валютой счета, за исключением корпоративных карточек Visa Business (далее – Карточка).

7. Участники Игры.

7.1. Участниками Игры могут быть физические лица, держатели Карточек, достигшие 18 лет – граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором или с Банком, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с такими лицом в отношениях свойства. Члены комиссии также не могут быть участниками Игры.

8. Состав и размер призового фонда.

Таблица 1

№	Название	Далее в Правилах	Кол-во, шт.	Стоимость за единицу с НДС, бел. руб.	Итого, бел. руб.
1	Денежный приз в размере 10 000 белорусских рублей	Суперприз	1	10 000,00	10 000,00
	Дополнительные денежные средства			1 471,84	1 471,84
2	Денежный приз в размере 1 000 белорусских рублей	Приз 1	3	1000,00	3000,00
	Денежные средства			127,01	381,03
3	Денежный приз в размере 500 белорусских рублей	Приз 2	3	500,00	1500,00
	Денежные средства			52,30	156,90
3	Смартфон Apple Iphone 12 64GB/ MGJ83 (синий)	Приз 3	3	2899,62	8 698,86
	Денежные средства			410,86	1232.58
4	Электросамокат Yakama AP-H008-1-Ч (черный)	Приз 4	3	952,50	2857,50
	Денежные средства			119,91	359,73
Итого:					29 658,44

8.1. Призовой фонд Игры составляет 29 658 (двадцать девять тысяч шестьсот пятьдесят восемь белорусских рублей) 44 копейки и формируется за счет денежных средств и имущества Организатора.

9. Условия участия в Игре.

9.1. Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:

9.1.1. Являться и/или стать держателем Карточки.

9.1.2. Для участия в розыгрыше Призов 1 и 2:

Совершить не менее одной безналичной операции по оплате товаров/работ/услуг с использованием Карточки в сети Интернет и/или посредством платежных сервисов PAY (Apple Pay, Samsung Pay, Garmin Pay, Fitbit Pay, Кошелек Pay) на общую сумму не менее 300,00 (трехсот) белорусских рублей или в иной валюте на сумму, эквивалентную указанной сумме в белорусских рублях по курсу соответствующей валюты, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату совершения соответствующей безналичной операции, за исключением операций, указанных в пункте 9.2. Правил в каждый игровой период, указанный в Таблице 2.

9.1.3. Для участия в розыгрыше Приза 3:

Совершить не менее одной безналичной операции по оплате товаров/работ/услуг с использованием Виртуальной Карточки Visa ЗАО Банк BTB (Беларусь) на территории Республики Беларусь на общую сумму не менее 100,00 (ста) белорусских рублей или в иной валюте на сумму, эквивалентную указанной сумме в белорусских рублях по курсу соответствующей валюты, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату совершения соответствующей безналичной операции, за исключением операций, указанных в пункте 9.2. настоящих Правил в каждый игровой период, указанный в Таблице 2.

9.1.4. Для участия в розыгрыше Приза 4:

Совершить оплату услуг (аренды) в приложении Колобайк на общую сумму от 10,00 (десяти) белорусских рублей с использованием Карточки в каждый игровой период, указанный в Таблице 2.

9.1.5. Для участия в розыгрыше Суперприза:

Совершить не менее одной безналичной операции за весь игровой период с использованием Карточки Visa ЗАО Банк BTB (Беларусь) в сети Интернет и/или посредством платежных сервисов (PAY) на общую сумму **от 900,00 (девятисот) белорусских рублей**.

В случае если данное условие выполнено с использованием Виртуальной карточки ЗАО Банк BTB (Беларусь), выпущенной в период проведения Игры, Участник получает 1 дополнительный шанс. Дополнительный номер присваивается сразу после основного или же после еще одного дополнительного, в случае если Участник выполнил также условия с Виртуальной карточкой.

9.1.6. Согласие на участие в Рекламной игре, а также на предоставление ЗАО Банк BTB (Беларусь), Организатору своих персональных данных и информации, составляющей банковскую тайну, подтверждается Участником при заключении им Договора об использовании карточки с Банком на условиях в порядке и по форме, установленной Банком.

9.1.7. Каждому участнику после выполнения обязательных условий участия в Игре присваивается 1 (один) порядковый номер по фамилии, имени, отчеству (при наличии) участника в алфавитном порядке. В случае полного совпадения фамилии, имени, отчества участников, номер присваивается в соответствии с порядковым номером мобильного телефона (без кода страны и оператора) в порядке с 1 до 9.

9.2. Не являются основанием для участия в Игре:

- безналичные операции, совершенные до 20.06.2021 и после 10.09.2021;
- безналичные операции на общую сумму, не соответствующую любому из условий, установленных в п. 9.1. настоящих Правил;
- операции по погашению кредитов/факторинга/лизинга/А1 Кошелек, пополнению банковских вкладов (депозитов), счетов и оплате банковских комиссий, а также переводы денежных средств с одной карточки на другую (в том числе на карточки других банков) и переводы со счета на счет, переводы с карточки на счет и со счета на карточку;
- операции, совершенные в устройствах самообслуживания и сервисах https://e-pay.by/, https://pay.bgpb.by и аналогичных им, за исключением операций оплаты товаров/работ/услуг, совершенных посредством системы дистанционного банковского обслуживания Интернет-банк ЗАО Банк BTB (Беларусь) «VTB mBank (Belarus)» (WEB-версия/мобильное приложение);
- операции безналичной оплаты в казино и иных игорных заведениях, оплаты ставок и пари;
- операции безналичной оплаты финансовых и брокерских услуг;
- операции по приобретению электронных денег;
- операции по оплате услуг мобильных операторов и Интернет-провайдеров;
- операции, по которым был осуществлен возврат товаров/услуг с перечислением денежных средств на Карточку Участника;
- операции безналичной оплаты в устройствах банков, установленных в РУП «Белпочта».

9.3. В Игре участвуют операции безналичной оплаты товаров и услуг, совершенные в период с 20.06.2021 по 10.09.2021. Определение участников Игры, соответствующих настоящим Правилам, производится отдельно по каждому счету участника Игры. В случае если одно физическое лицо выполнило настоящие условия участия в Игре по нескольким счетам, данное физическое лицо фиксируется в качестве участника в списке участников Игры соответствующее количество раз.

Одно физическое лицо может участвовать в Игре неограниченное количество раз при выполнении им условий, указанных в п. 9.1 Правил.

9.4. Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенных операций участниками Игры, в том числе обратиться в Банк в целях проверки совершенных операций на предмет их соответствия Правилам (с соблюдением требований законодательства о банковской тайне и персональных данных физических лиц).

10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда.

10.1 Место проведения розыгрышей призов – г. Минск, ул. Ольшевского, 22, оф. 902.

10.2. Всего за период проведения Игры Организатором проводятся 3 (три) розыгрыша призового фонда, согласно Таблице 2, в ходе которого победители Игры будут определяться, исходя из присвоенных участникам, в соответствии с условиями Правил, порядковых номеров.

Таблица 2

Дата и время розыгрыша	Призы розыгрыша	Период совершения безналичных операций
16.07.2021 в 14.00	Приз 1, 1 штука	С 00.00.00 20.06.2021 по 23.59.59 11.07.2021
	Приз 2, 1 штука	
	Приз 3, 1 штука	
	Приз 4, 1 штука	

Дата и время розыгрыша	Призы розыгрыша	Период совершения безналичных операций
16.08.2021 в 14.00	Приз 1, 1 штука	С 00.00.00 12.07.2021 по 23.59.59 10.08.2021
	Приз 2, 1 штука	
	Приз 3, 1 штука	
	Приз 4, 1 штука	
15.09.2021 в 14.00	Приз 1, 1 штука	С 00.00.00 11.08.2021 по 23.59.59 10.09.2021
	Приз 2, 1 штука	
	Приз 3, 1 штука	И для Суперприза с 00.00.00 20.06.2021 по 23.59.59 10.09.2021
	Приз 4, 1 штука	
	Суперприз, 1 штука	

10.3. Для осуществления розыгрыша Организатор формирует список на основании данных об участниках Игры, выполнивших условия Игры, определенные п. 10 Правил, предоставленных Организатору Банком. Список включает порядковые номера участников, присвоенные в соответствии с условиями Правил, фамилию, имя, отчество (при наличии), адрес и номер мобильного телефона участника Игры, выполнившего соответствующие условия Правил (далее – «массив»).

10.4. Для определения выигрышных номеров Организатор использует лототрон и набор шаров в количестве 10 штук с цифрами от 0 по 9.

10.5. Определение выигрышных номеров (для призов 1-4 и Суперприза) происходит путем их формирования слева направо из цифр в шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

10.6. Для определения цифры первого слева разряда выигрышного номера Организатор помещает в лототрон шары с цифрами от 0 до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в массиве. Организатор извлекает из барабана один шар. Цифра из извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

10.7. Далее в лототрон загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из лототрона извлекается один шар, цифра в котором определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах номеров массива. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера – и шар возвращается в лототрон; в противном случае извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон и Организатор извлекает следующий шар до получения нужного совпадения. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов номеров в массиве.

10.8. В ходе розыгрыша определение победителей призов проводится в последовательности, указанной в Таблице 2.

10.9. В случае, если номер участника в соответствующем розыгрыше, определенный согласно п. 10.4–10.8. Правил, совпадает с одним из зафиксированных ранее выигрышных номеров в таком розыгрыше, выигрышным считается номер, следующий за этим номером.

10.10. После определения победителей (основных победителей) розыгрыша для обеспечения полной выдачи призов Организатор осуществляет определение резервных победителей в количестве, соответствующем количеству победителей розыгрыша. Резервным победителем становится следующий номер за основным победителем, при условии, что он не является основным победителем. В таком случае берется следующий номер до выполнения данного условия.

10.11. При вручается резервному победителю в случае, если основной победитель:

10.11.1. отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора;

10.11.2. нарушает (не выполняет) условия Правил, в том числе не представляет необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленном Правилами;

10.11.3. не выходит на связь с Организатором и не является для получения приза в сроки, установленные Правилами (п. 11. Правил);

10.11.4. отказывается от подписания документов, фиксирующих факт выдачи приза, и иных документов, выставляемых из участия в Игре;

10.11.5. в ходе проверки Организатором установлен факт, что победитель в период участия в Игре осуществлял возвраты средств на карточку сумму операций, совершенных ранее и зафиксированных в Игре операций.

10.12. В случае если и основной, и резервный победитель, претендующие на получение призов, не соблюдают условия Правил, в результате чего теряют право получения призов, такие призы остаются в распоряжении Организатора.

11. Срок и способ информирования победителей розыгрыша, место, порядок и сроки вручения призов.

11.1. Организатор уведомляет победителя о выигрыше путем рассылки смс, а также звонком по контактному номеру телефона, имеющемся в распоряжении Организатора, а также дополнительно может уведомить заказным письмом по адресу проживания в течение 2 (двух) суток после розыгрыша.

11.2. Победитель/резервный победитель призов 2-4 может получить выигранный им приз следующим образом:

11.2.1. Победителям, проживающим в г. Минске или не проживающим на указанной территории, но желающим получить свои призы путем самовывоза по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902, необходимо явиться в сроки до 21.09.2021, с 10.00 до 17.00 в рабочие дни или с 11.00 по 13.00 в субботу 18.09.2021 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902, предварительно связавшись с Организатором по телефону +375 (33) 696-17-16 или по адресу электронной почты: visa@yaskrava.by, и предоставить Организатору лично документ, удостоверяющий личность (паспорт гражданина Республики Беларусь или вид на жительство в Республике Беларусь) для использования данных при оформлении необходимых документов в рамках Игры.

11.2.2. Для победителей призов 3-4, проживающих вне г. Минска, желающих получить свои призы по месту своего проживания, а также победителей призов 1-2 и Суперприза необходимо созвониться с Организатором по телефону +375 (33) 696-17-16 и отправить по адресу электронной почты visa@yaskrava.by отсканированные копии документов, перечисленных в п. 11.2.1. Правил. Победителям Призов 1-2, а также Победителю Суперприза также необходимо предоставить номер расчетного счета в белорусских рублях для зачисления Призов/Суперприза. Перечисление призов 1-2 и/или Суперприза производится до 21.09.2021 включительно.

11.2.3. Резервные победители уведомляются в срок до 23.09.2021. Срок предоставления необходимых документов для перечисления сумм призов 1-2 и/или Суперприза, а также доставки призов 3-4 для резервных победителей – до 26.09.2021 включительно. Срок выдачи призов 3-4, а также перечисления призов 1-2 и/или Суперприза – до 28.09.2021 включительно.

11.2.4. После получения необходимых документов Организатор осуществляет за счет собственных средств доставку призов победителям, проживающим вне г. Минска, по адресу, указанному победителем в качестве адреса проживания. Датой выдачи приза является дата передачи приза курьерской службе (перевозчику) или почтовой службе.

При получении приза победитель обязуется:

- при доставке приза предъявить курьеру, работнику почтовой службы оригиналы документов, перечисленные в п. 11.2.1. Правил;
- подписать лично все необходимые для получения приза предъявленные документы.

11.2.5. В случае если Победитель не может получить Приз лично, получить его Приз может его доверенное лицо по предъявлении своего паспорта (вида на жительство) и доверенности от Победителя, удостоверенной нотариально.

11.3. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах.

11.4. При получении приза победители несут все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводятся в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь, и осуществляются Организатором. Удержание с победителей подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим налоговым агентом) в момент выдачи приза из денежной части приза (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

12. Права и обязанности участников Игры.

12.1. Факт участия в Игре подразумевает, что участники соглашаются на безвозмездной основе давать рекламные интервью об участии в Игре и использовании призов Игры, в том числе по радио, телевидению, в сети интернет и в иных средствах массовой информации, а также участвовать в видео-, аудио- и фотосессиях для изготовления рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие материалы будут принадлежать Организатору на безвозмездной основе.

12.2. Заключая с Банком договор об использовании карточки ЗАО Банк BTB (Беларусь), Участник выражает(-л) свое добровольное письменное согласие на участие в рекламных играх, рекламных акциях, программах предоставления скидок/бонусов, программах повышения лояльности и/или иных программах маркетинга (далее – рекламные кампании), проводимых Банком или третьей стороной – организатором (оператором), заинтересованным лицом которых является Банк, если иное не предусмотрено в правилах проведения конкретных рекламных кампаний, а также на предоставление права Банку осуществлять определение резервных победителей самостоятельно, предоставление третьим лицам любых сведений и документов, составляющих банковскую тайну Клиента (Участника), а также на сбор, передачу, обработку, использование и хранение Банком предоставленных Клиентом (Участником) в Банк сведений и документов, включая основные и дополнительные персональные данные, с учетом их последующих изменений.

12.3. Участием Участника в Рекламной игре подтверждается ознакомление и полное согласие Участника с настоящими Правилами и принятие им на себя обязательств выполнять и соблюдать все их условия, а также требования законодательства Республики Беларусь, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением призов в результате участия в Игре.

13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.

13.1. Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Игры.

13.2. Результаты Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 23.09.2021.

14. Общие положения.

14.1. Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Игры, а также результаты проведения Игры, могут быть обжалованы в установленном законодательством порядке.

14.2. Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенных операций Победителями Рекламной игры.

14.3. Компания Visa и любые ее аффилированные лица, как и Банк и любые его аффилированные лица (за исключением лиц, входящих в состав Комиссии по проведению Игры), не являются Организатором, не принимают участия в розыгрыше, а также определении победителей, за исключением лиц, входящих в состав Комиссии по проведению Игры, не несут ответственности за соблюдение Организатором Правил, законодательства Республики Беларусь, а также не отвечают по претензиям участников Игры.

14.4. Организатор не несет ответственность, если не по вине Организатора у участника отсутствует доступ к сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет), электронной почте, за работу операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с участником и т. д.), почтовой службы (сроки доставки и т. д.). Организатор не компенсирует участнику расходы, связанные с оплатой транспортных расходов при посещении офиса Организатора.

14.5. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае предоставленной Участником Организатору или Банку недостоверной информации о его контактных данных.

14.6. Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону «горячей линии» Организатора +375 (33) 696-17-16 с 10.00 до 16.00 в рабочие дни, по электронной почте: visa@yaskrava.by, а также на интернет-сайте ЗАО Банк BTB (Беларусь): www.vtb-bank.by.

Свидетельство о государственной регистрации № 4020 выдано 14.06.2021 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

ЖЫВЫЯ І МЁРТВЫЯ

(Заканчэнне.
Пачатак тэмы на 1-й стар.)

Хімік удзельнічаў у абарончых баях пад Мінскам і Магілёвам. Трапіў у палон, але паспеў праз некага паведаміць, дзе ён. Агаф'я, якая рыскаклася ў Магілёў на кані, там свайго мужа не знайшла. У Оршу (больш за 70 кіламетраў!), куды яго перавялі, жонка ішла пешшу з трохмесячным сынам на руках. Яна выкрала мужа з палону і, абяссіленага, прывяла дамоў. Толькі лёс не падманеш: праз тыдзень Хімік расстралялі ў Дрыбіне, у агульнай магіле з яўрэямі. Неўзабаве забілі яго маці, сястру і яе дзяцей.

«Вы не можаце ўявіць, як мы перажылі гэты час, — пісала Агаф'я Барысенка сваякам свайго мужа ў Маскву. — Я не думала, што застануся нармальным чалавекам... Яшчэ вялікае шчасце, што я і мой сынок засталіся жывымі. Я чакала кожны дзень смерці, нават прызвычаілася да гэтай думкі і хацела, каб хутчэй мяне забілі: жыць не хацелася...»

Міхаіл і Вера Зялёнкіны пасля ўручэння Міхаілу зоркі Героя Савецкага Саюза (май 1946 года).

Юрый Трыфанаў і Валянціна Жукава пажаніліся літаральна ў першыя дні вайны — у лістападзе 1941-га. Яны, дарослыя людзі, добра разумелі, што могуць больш ніколі не сустрэцца, але ўсё ж адважыліся на такі сур'ёзны крок. Юрый і Валянціна былі разам са школьнай лаўкі: спачатку вучыліся ў адной з пскоўскіх школ, потым разам паступалі ў Ленінград: ён — у медінстытут, яна — у інстытут дакладнай механікі і оптыкі. Вайна разлучыла іх на доўгія пяць гадоў. Юрый быў мабілізаваны хірургам-ардынатарам у эвакашпіталь, пасля ратаваў жыцці на перадавой. Валянціна перажыла найбольш цяжкі і галодны год у блакадным Ленінградзе, затым эвакуявалася ў Волагду, пасля пераехала ў Харкаў. Усю вайну муж і жонка перапісваліся, але сустрэліся толькі ў 1946 годзе. З таго часу больш ніколі не расставаліся.

Незадоўгі да гэтага Аляксандра і Лідзіі Барысавых. Намеснік камандзіра батарэі 44-га артылерыйскага палка ўдзельнічаў у абароне Беларусі. У ліпені 1941 года трапіў у палон, прайшоў праз некалькі канцлагераў. У чэрвені 1943 года яму цудам удалося збегчы. Уступіўшы ў партызанскі атрад імя Ракасоўскага брыгады імя Жукава, які дзейнічаў у Баранавіцкай вобласці, быў і камандзірам атрада, і начальнікам штаба. Пасля вызвалення Беларусі Аляксандр Барысаў уладкаваўся выкладчыкам у Магілёўскую школу механізацыі сельскай гаспадаркі. Толькі папрацаваў там нядоўга: за тое, што быў у палоне, яго арыштавалі — напярэдзе Аляксандра чакала 10-гадовая ссылка ў выпраўленча-працоўны лагер у Рэспубліку Комі.

Аляксандр і Валянціна Яворскія з сынам Віталём (1940 г.).

Трагічна склаўся лёс і ў сям'і Аляксандра і Валянціны Яворскіх. Маладая настаўніца выйшла замуж за кадравага вайскоўца ў 18 гадоў. Неўзабаве ў іх нарадзіўся сын Віталік. Гэта быў вельмі моцны шлюб, у іх было шмат планаў і мар, якім не суджана было здзейсніцца. Па першай трывозе Аляксандр пайшоў у вайсковую часць (жылі яны ў Навагрудку). Больш муж і жонка ніколі не бачыліся... Валянціна ўсё жыццё перажывала, што яны нават не развіталіся. Яшчэ яе доўгі час непакоіла тое, што Саша не ўзяў з сабой свайго шыняля.

Валянцін МАЗЕЦ: Галоўнае негатыўнае наступства Рыжскага міру — запавеленне нацыятворчых працэсаў. Бо беларуская нацыя была маладой нацыяй, якая на момант яго заключэння была яшчэ на стадыі фарміравання, кансалідацыі. Не было яшчэ канчатковай еднасці, хоць працэс яднання ішоў — і падчас Усебеларускага з'езда ў 1917 годзе, і падчас спробы стварэння БНР у 1918 годзе, і падчас утварэння ССРБ у 1919 годзе беларусы дэкларавалі жаданне жыць у сваёй дзяржаве. А нацыя, як вядома, можа фарміравацца толькі ў нацыянальнай дзяржаве. І вось гэты працэс фарміравання правядзенне мяжы па-жывому быў практычна спынены на некаторы час.

«ЗВЯЗДА»: Але ж напачатку палякі на атрыманых у выніку Рыжскай дамовы беларускіх землях стараліся стварыць хоць бы імітацыю захавання нейкіх правоў беларусаў. Праўда, зусім нядоўга...

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ: Палякі ж таксама разумелі, што яны забіраюць кавалак тэрыторыі, якая не з'яўляецца этнічна польскай. Юзаф Пілсудскі, калі ў час польска-савецкай вайны прыязджаў у верасні 1919 года ў акупаваны польскімі войскамі Мінск, абяцаў беларускім нацыянальным дзеячам, што будзе аўтаномія, абяцаў адрадзіць правобараз Рэчы Паспалітай, якая існавала на федэратыўных пачатках... Але абяцанні спраўджаныя не былі і атрымалася ўсё інакш. Прычына ў тым, што ў міжваеннай Польшчы атрымала перамогу не федэралісцкая канцэпцыя, якую напачатку агучваў і Пілсудскі, а канцэпцыя нацыяналіста Рамана Дмоўскага, які не лічыў беларусаў гістарычным народам, быў перакананы, што беларусы павінны быць асіміляваныя. І гэта канцэпцыя выконвалася няўхільна — яна мела на ўвазе, што беларускае насельніцтва павінна стаць польскім, і адступаць у яе рэалізацыі польская кіруючая эліта (не народ, а менавіта кіраўнікі) не жадала.

«ЗВЯЗДА»: Усходняя частка Беларусі — ССРБ, а пасля БССР, таксама ў хуткім часе, менш чым праз два гады, таксама стала часткай іншай дзяржавы — СССР. У чым тады прынцыповая розніца, спытае той жа скептык...

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ: Калі мы паглядзім на дзве часткі падзеленай беларускай тэрыторыі — розніца будзе каласальная. Так, у сакавіку 1921 года Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі захавалася ў вельмі невялікім выглядзе — шэсць паветаў вакол Мінска. Але яна захавалася і, па ўмовах Рыжскага дагавора, была прызнаная як самастойная дзяржава. І ў снежні 1922 года стала адной з рэспублік-заснавальніц СССР. У ёй быў уласны дзяржаўны апарат, дзеячы, якія ставілі перад сабой мэту аб'яднаць вакол ужо згаданых шасці паветаў усе беларускія землі, якія аказаліся ў складзе іншых дзяржаў. І на ўсходнім баку тэта стала магчыма — спачатку ў 1924 годзе, пасля ў 1926-м да БССР былі далучаныя тэрыторыі, на якіх пражывалі беларусы — большая частка сучасных Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей. Гэта была ініцыятыва нацыянальных беларускіх дзеячаў, і яна была падтрымана ў

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.

Вадзім ЛАКІЗА.

Сяргей ТРАЦЦЯК.

Валянцін МАЗЕЦ.

Маскве. Што датычыцца заходняй часткі беларускіх земляў і пазіцыі Варшавы — тут не даводзіцца гаварыць не толькі аб аб'яднанні — нават аб выкананні міжнародных абавязацельстваў у адносінах да трох мільёнаў чалавек.

Валянцін МАЗЕЦ: Адзін са стваральнікаў Беларускай Сацыялістычнай Грамады Антон Луцкевіч у 1928 годзе пісаў пра тое, што ва ўсход ад «Рыжскай мяжы» адбываецца станаўленне беларускай дзяржаўнасці.

Сапраўды, пасля таго як шэсць паветаў Мінскай губерні у 1924 і 1926 годзе былі ўз'яднаныя з усходнімі беларускімі землямі, працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці набыў трывалую, этнатэрытарыяльную аснову.

Сяргей ТРАЦЦЯК: Рыжскі мір стаў не толькі прычынай падзелу беларускага народа, але і перадумовай для стварэння беларускага «п'емонту» — той самай невялікай тэрыторыі з шасці паветаў на ўсходнім баку, якая стала дзяржаўным цэнтрам, вакол якога павінна было ўрэшце аб'яднацца ўсё беларускае насельніцтва (што ў 1939 годзе ў выніку практычна і адбылося). Гэта, дарэчы, вельмі добра ўсведамляў Эдвард Вайніловіч, які пра Рыжскі мір пісаў: маўляў, мы, палякі, самі стварылі сітуацыю беларускага «п'емонту» і паставілі сябе ў становішча, калі беларусы нас ненавідзяць за тое, што мы іх падзялілі. Бо мы ім увесь час казалі: «За вольнасць вашу і нашу». І дзе ж беларская вольнасць?

«Было малазямелле, сялянам не хапала зямлі, бо існавалі велізарныя панскія абшары, прамысловасць тут таксама не развівалася, вялізным было беспрацоўе. Фактычна Заходняя Беларусь была для карэнных польскіх рэгіёнаў крыніцай таннай сыравіны і працоўнай сілы».

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ: Увогуле можна ўпэўнена сказаць так: пакуль на ўсходзе беларусы будавалі сваю нацыянальную дзяржаву, на захадзе яны не былі раўнапраўнымі ні ў нацыянальным, ні ў культурным, ні ў эканамічным, ні ў палітычным жыцці. У 1938 годзе была зачынена апошняя беларуская школа, у польскім Сейме не засталося ні аднаго этнічнага беларуса. Польскае кіраўніцтва ад пачатку ставіла задачу па паланізацыі беларускага насельніцтва. Пра гэта ёсць дакументальныя сведчанні, і нямала. Блок Польскіх левых сіл у сваёй петыцыі ад 1926 года так ацэньвае сітуацыю ў першай палове 20-х гадоў, калі яшчэ не ўсталявалася дыктатура Пілсудскага, пры якой асабліва ўзмацніўся нацыянальны ўціск: «Падчас праўлення Хіена-Пяста асабліва цяркпелі ўкраінскі і беларускі народы, у якіх была адабраная проста магчымасць жыць і развівацца на культурна-асветніцкай, палітычнай і эканамічнай арэне». А вось дакумент 1930 года — лісты сялян: «Павятовая адміністрацыя і паліцыя Крэсаў Усходніх ставіць усялякія перашкоды развіццю жыцця палітычнага і нават культурна-асветнага толькі таму, што жыццё гэта — беларускае». А вось вытрымкі з пратакола нарады, якая праходзіла ў Гродне ў 1937 годзе: «Польская культура павінна быць галоўнай на паўночна-ўсходніх землях... Максімальная мэта — гэта асіміляцыя мясцовага элемента — беларускага... Мясцовыя землі не з'яўляюцца польскімі, моцна адрозніваюцца. Значыць, іх абавязкова трэба зрабіць польскімі... Усходнія землі, між намі, трэба другі раз зававёўваць знутры...» Ставіліся канкрэтныя задачы паланізацыі, і яны няўхільна праводзіліся польскімі ўладамі ў жыццё.

Сяргей ТРАЦЦЯК: У 1925 годзе былы прэм'ер Польшчы Скульскі заявіў дэпутатам Беларускага пасольскага клуба ў Сейме: маўляў, праз 10 гадоў вы не знойдзеце тут ніводнага беларуса. У 1935 годзе ніводнага беларуса ў Сейме сапраўды не было. Але ў Заходняй Беларусі беларусы былі, таму і пачалася такая панічная рэакцыя ўлад, што ўсе намаганні зрабіць з беларусаў палякаў пацярпелі крах...

Польскі ўрад адразу, яшчэ ў адносна дэмакратычныя часы, узяў курс на выцясненне беларускага настаўніка са школ Заходняй Беларусі. Рабілі рэкіроўку: настаўнікаў з беларускіх тэрыторый адпраўлялі ў цэнтральную ці заходнюю Польшчу, а да беларускіх дзяцей прысылалі настаўнікаў адтуль. Настаўнікаў, некатарыя з якіх нават паняцця не мелі, куды яны едуць, і стаўленне да мясцовага насельніцтва ў іх было як да нейкіх паўдзікуноў.

Наш гісторык Уладзімір Ганскі правёў вельмі цікавае даследаванне аб развіцці турызму ў міжваеннай Польшчы. Дык вось, з заходніх і цэнтральных рэгіёнаў краіны туры на беларускія землі ладзіліся ў вялікай колькасці: экзотыка, маўляў. А беларусам з'ездзіць паглядзець на захад не прапаноўвалі... Калі яны і траплялі туды, дык толькі ў пошуках работы...

Валянцін МАЗЕЦ: Беларусы цяпрелі дыскрымінацыю і ў галіне эканомікі. Дакументы сведчаць, што ў галіне гандлю на іншых тэрыторыях Польшчы дзейнічалі адны законы, а ў Крэсах Усходніх мясцовыя ўлады для беларусаў выдавалі іншыя, вобразна кажучы, з паніжаючым каэфіцыентам. Калі ты называўся палякам, табе было нашмат прасцей адкрыць свою справу, напрыклад, атрымаць участак пад будаўніцтва... І гэта не суб'ектыўныя сцвярджэнні — на гэту тэму ўжо напісаныя дысертацыі з выкарыстаннем дакладных крыніц, у тым ліку і з польскіх архіваў...

Вадзім ЛАКІЗА: Так, канкрэтным доказам гэтых фактаў стала кандыдацкая дысертацыя Ларысы Лаўрэнкі «Прамысловасць, рамесніцтва і гандаль на тэрыторыях Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.), якая паспяхова была абаронена ў савеце нашага Інстытута літаратура тыдзень таму. Згадаю толькі адзін невялікі тэзіс з гэтай работы: «...Заходнебеларускі рэгіён выпучаўся невысокім узроўнем урбанізацыі і развіцця індустрыі з-за слабага прытоку капіталаўкладанняў, незацікаўленасці польскіх улад». Яшчэ спашлюся і параю нашым апанентам пазнаёміцца з доктарскай дысертацыяй Віталія Крывуця «Маладзёжная палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.), таксама абароненую ў нашым інстытуце некалькі месяцаў таму. «Асновай маладзёжнай палітыкі польскіх улад, у тым ліку на тэрыторыі Заходняй Беларусі, з'яўлялася канцэпцыя «дзяржаўнага выхавання», якая ставіла перад сабой мэту выхавання ўзорнага грамадзяніна-дзяржаўніка... што ператварала яе ў найважнейшы інструмент паланізацыі маладога пакалення нацыянальных меншасцяў міжваеннай Польшчы», даказвае вучоны.

Сяргей ТРАЦЦЯК: На савецкім баку для беларусаў і ўкраінцаў 20-я і 30-я гады, нават нягледзячы на тое, што палітыка нацыянальнага адраджэння была згорнута на пачатку 30-х, былі часам небывалага сацыяльнага ўздыму. Сялянскія дзеці мала таго, што атрымлівалі адукацыю, прычым на роднай мове, дык яшчэ і маглі стаць ваеннымі, настаўнікамі, урачамі. Такой магчымасці на заходнім баку ад мяжы беларусы не мелі ад пачатку. А сувязі паміж сем'ямі, паміж раднёй, падзеленай мяжой, не былі канчаткова страчаныя. І як было даведацца брату на польскім баку, які разам з дзецьмі парабкаваў на пана ці туліўся на невялікім кавалку зямлі, што сын брата на савецкім баку стаў, напрыклад, лётчыкам...

«ЗВЯЗДА»: Не дзіва, што на заходніх тэрыторыях людзі не толькі абураліся, але і супраціўляліся.

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ: Нават прыведзеныя дакументы таму сведчанне: у другой палове 30-х гадоў пры ўсіх намаганнях «беларускае пытанне» так і не было вырашана. Людзі сябе палякамі не ўсведамлялі.

Валянцін МАЗЕЦ: Тыя нацыянальныя грамадска-палітычныя сілы, якія былі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, імкнуліся да супольнага адстойвання нацыянальных інтарэсаў. У 1922 годзе да выбараў у Сейм быў створаны Беларускі пасольскі клуб, у якім прадстаўнікі розных плыняў і пераканнанняў, нягледзячы на палітычныя рознагалоссі, аб'ядналіся, каб адстойваць нацыянальныя інтарэсы беларусаў.

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ: І трэба сказаць, што найбольш масавы нацыянальны рух у Заходняй Беларусі развіваўся ў лева-радыкальным кірунку, пры падтрымцы кампартыі, арыентаваўся менавіта на савецкія ідэі. Само сацыяльнае становішча беларусаў у Польшчы заганяла іх у тупік, бо да нацыянальна прыгнёту дадаваўся яшчэ і сацыяльны, ды і сусветны эканамічны крызіс 1929—1933 гадоў не прайшоў бясследна. Было малазямелле, сялянам не хапала зямлі, бо існавалі велізарныя панскія абшары, прамысловасць тут таксама не развівалася, вялізным было беспрацоўе. Фактычна Заходняя Беларусь была для карэнных польскіх рэгіёнаў крыніцай таннай сыравіны і працоўнай сілы. Гэтыя цяжкасці падштурхоўвалі да перарыентацыі на камуністычны рух...

«ЗВЯЗДА»: І гэта ў любы час магло выбухнуць у паўстанне ці ўвогуле рэвалюцыю. Выходзіць, лічыць, што 17 верасня стала магчымым толькі таму, што быў падпісаны пакт Молатава-Рыбентропа і Германія напала на Польшчу, — занадта прымітыўна?

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ: Палітыка, якая праводзілася польскімі ўладамі, была заганная і ў рэшце рэшт сапраўды магла прывесці да сацыяльнага выбуху, які б невядома чым скончыўся. Але гісторыя, як вядома, не церпіць умоўнага ладу.

Што датычыцца пакта Рыбентропа-Молатава (менавіта так варта яго называць, бо падпісваўся ён па ініцыятыве Германіі), дык такіх пактаў у нацысцкага ўрада было шмат. Пагадненне з Савецкім Саюзам, якое ў жніўні 1939-га падпісала Германія, было па храналогіі апошнім з пагадненняў аб ненападзенні. Першае такое пагадненне з нацыстамі падпісала тая ж Польшча ў 1934 годзе. (Пасля, у 1938 годзе, палякі падпісалі яшчэ і сакрэтны пратакол да яго — аб падзеле Чэхаславакіі, паводле якога Польшча атрымала Цешынскую вобласць). Францыя і Вялікабрытанія падпісалі ў 1938 годзе аналагічнае пагадненне, Літва, Данія, Эстонія і Латвія — у сакавіку, маі і чэрвені 1939 года...

Можна сказаць, што падпісаны пакт Рыбентропа-Молатава даў магчымасць беларусам і ўкраінцам ліквідаваць гістарычную несправядлівасць, ён стаў лагічным завяршэннем тых складаных геапалітычных працэсаў, якія пачаліся з падпісанне Рыжскага міру, а то і да яго. Казаць, што ў выніку падпісання пагаднення Германія напала на Польшчу, — няправільна, бо дагавор з Польшчай аб ненападзенні Германія разарвала яшчэ 28 красавіка 1939-га. А 15 чэрвеня 1939 года Гітлер падпісаў дырэктыву аб нападзенні на Польшчу і 22 жніўня аддаў распараджэнне пачаць вайну 1 верасня.

Валянцін МАЗЕЦ: Існуе меркаванне, што падпісанне Рыжскага дагавора фактычна закладала міну запаволенага дзеяння пад сістэму калектыўнай бяспекі, якая выбудоўвалася паводле Версальска-Вашынгтонскіх пагадненняў. На працягу ўсяго існавання Польская дзяржава знаходзілася ў стадыі перманентнай вайны, не могучы дамовіцца са сваімі суседзямі, заключыць з імі мірныя пагадненні. Рана ці позна ўсё б скончылася вашынымі дзеяннямі, бо, як пісаў хтосьці з гісторыкаў, Польская дзяржава «адкусіла» такі вялікі кавалак на ўсходзе, што праглынуць яго не змагла і ўрэшце падавілася.

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ: З-за недальнабачнай палітыкі кіруючай эліты Польшча ўмудрылася пассварыцца з усімі суседзямі. Польшча спадзявалася на падтрымку Вялікабрытаніі і Францыі, з якімі ў яе былі падпісаныя пагадненні. Ну і як яны дапамаглі? Пры маўклівай згодзе і бяздзеянні саюзнікаў Польская дзяржава ў верасні 1939 года была ліквідавана нацыстамі.

«ЗВЯЗДА»: А беларусы на захадзе, дзякуючы 17 верасня, атрымалі амаль двухгадовую адтэрміноўку ад фашысцкай акупацыі. Яны, канешне, восенню 1939 гэтага яшчэ не ведалі, але Чырвоную Армію сустракалі радасна. Прынамсі ў большасці сваёй...

Вадзім ЛАКІЗА: Я родам з Заходняй Беларусі — Дзятлаўскага раёна, мая матуля — з Нясвіжскага. Я ніколі ў жыцці ні ад бабуль, ні ад мамы, якая жатва трансліравадь думкі старэйшых, не чуў ніводнага дзённага слова адносна падзей восені 1939 года... Па ўспамінах, у другой палове дня 17 верасня ў некаторых вёсках Дзятлаўшчыны, напрыклад Явары, Раготне, Вензаўцы, былі падрыхтаваны трыумфальныя аркі («брамы») для ўрачыстай сустрэчы Чырвонай Арміі. «Гучалі рэвалюцыйныя і савецкія песні. Людзі смяяліся, плакалі ад радасці, віншавалі адзін аднаго з доўгачаканай свабодай». Падобныя станоўчыя эмоцыі сустрэчы чырвонаармейцаў на цэнтральнай плошчы мястэчка знайшлі адлюстраванне нават у графічнай рабоце «Вызваленне Дзятлаўшчыны (верасень 1939)», якую намаляваў сялянскі хлопец, мастак з Навагрудчыны Сямён Герус, які быў сведкам тых падзей. Глядзіш на малюнак і знаходзіш знаёмыя абрысы жылых пабудоў і архітэктурных помнікаў, якія захаваліся з тых часоў і ўпрыгожваюць ужо сучасную Плошчу 17 верасня раённага цэнтра горада Дзятлава.

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ: Трэба заўважыць, што падчас вызваленчага паходу Чырвонай Арміі, які распачаўся 17 верасня, гаворка не ішла аб ваенных дзеяннях. Польская дзяржава вайна не аб'яўлялася — польскі ўрад на той момант ужо выехаў з краіны — не было кому аб'яўляць, каб і хацелася. Сустракалі вызваліцеляў прыязна, станоўча — аб гэтым таксама ёсць дакументальныя сведчанні. Канешне, былі незадаволеныя, але большасць людзей успрымала гэта як вызваленне. Бо станоўчыя эрухі найперш у сацыяльнай сферы былі відавочныя, хоць да вайны заставалася менш чым два гады.

Дзякуючы таму, што нашы заходнія землі былі далучаныя да Савецкага Саюза, беларусы захавалісяя як народ, таму што былі часткай краіны-пераможцы. СССР выратаваў свае народы ад знішчэння нацыстамі, якія доўгі час пры маўклівай згодзе заходніх суседзяў рухаліся на ўсход, знішчаючы на акупаваных тэрыторыях большую частку насельніцтва.

«У другой палове 30-х гадоў пры ўсіх намаганнях «беларускае пытанне» так і не было вырашана. Людзі сябе палякамі не ўсведамлялі».

Валянцін МАЗЕЦ: Уз'яднанне 1939 года было лагічным завяршэннем працэсу збірання беларускага народа вакол ядра з тых самых шасці паветаў, з якіх усё і пачалося для незалежнай Беларусі. 1924 год, 1926 год і нарэшце 1939 год — гэта фактычна этапы працэсу ўз'яднання беларускага народа ў межах аднаго дзяржаўнага ўтварэння — Беларускай ССР. Нездарма ў законе аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад БССР, прынятым 14 лістапада 1939 года, гучала фармулёўка: «вялікі беларускі народ уз'яднаны ў адзінай беларускай дзяржаве».

«ЗВЯЗДА»: Атрымліваецца, і 17 верасня, і 14 лістапада — даты сапраўды для нашага народа лёсавызначальныя. Чаму ж іх значнасць змяншаравалася ў грамадскай свядомасці? Зразумела, што праз два гады ўсё перакрыла самая жудасная вайна, і, адпаведна, і вызваленне, і перамога ў ёй. Але, напэўна, былі і іншыя прычыны...

Сяргей ТРАЦЦЯК: Народны сход Заходняй Беларусі 29 кастрычніка 1939 года абвясціў 17 верасня Днём вызвалення працоўных Заходняй Беларусі ад прыгнёту памешчыкаў і капіталістаў. Як бачым, фармулёўка была сацыяльная, а не нацыянальная. Дарэчы, да вайны ў святочных датах БССР значылася і 11 ліпеня 1920 года — як дата вызвалення ад бела-польскай акупацыі. Апошні раз дату 17 верасня адсвяткавалі нават на саюзным узроўні ў 1949-м — на 10-годдзе аб'яднання. А для БССР гэта быў і год 30-годдзя самой рэспублікі. Што датычыцца 17 верасня, то на нашым, рэспубліканскім, узроўні з 1948 года фармулёўка сацыяльная змянілася на нацыянальную — на першы план выйшла ўз'яднанне народа... Але ў 1950 годзе 17 верасня ўжо не святкавалася ніяк — ні на саюзным, ні на рэспубліканскім узроўні, ні з сацыяльнай фармулёўкай, ні з нацыянальнай. Хапіла невялікага сігналу з Масквы: маўляў, не трэба крыўдзіць палякаў. Польшча стала сацыялістычнай, важным саюзнікам СССР...

Валянцін МАЗЕЦ: Да 1949 года фактычна заваршылася размежаванне і абмен насельніцтвам паміж Польшчай і БССР. І адзначаць дату 17 верасня , якая ў 1939-м была аб'яўлена святочнай на беларускім з'ездзе ў тым жа Беластоку, які ў 1949 годзе ўжо знаходзіўся ў складзе Польскай дзяржавы, у геапалітычных абставінах таго часу было б не вельмі дарэчы.

Сяргей ТРАЦЦЯК: І трэба заўважыць: тое, што Польшчай кіравалі камуністы, у адносінах да беларускіх земляў нічога не мяняла. Як сведчаць крыніцы, тагачасныя польскія камуністы загатоўкі 1920—30-х гадоў былі ці не большымі шавіністамі, чым сам Пілсудскі. У Канстытуцыі, прынятай у часы прэзідэнцтва Баляслава Берута, таго самага героя, удзельніка Мінскага падполля ў гады вайны, не было ні слова сказана пра тое, што ў Польшчы ёсць хтосьці, акрамя палякаў...

Нягледзячы на тое, што ў сацыялістычнай Польшчы дзень 17 верасня называўся днём пачатку вызвалення працоўных Заходняй Беларусі ад прыгнёту, ён стыгматызаваўся і ў грамадскай свядомасці застаўся як дзень пачатку агрэсіі Савецкага Саюза супраць мірнай і бязабаронай краіны. Палякі забыліся, што іх мірная і безабаронная краіна сама ўдзельнічала ў расчляненні Чэхаславакіі, што яна ў сакавіку—красавіку 1939 года ледзь не развязала вайну з Літвой, што ўвогуле міжваенная Польшча не была «белай і пухнатай»...

«ЗВЯЗДА»: Але чаму маўчалі самі беларусы? Тыя ж дзеячы нацыянальнага руху з Заходняй Беларусі, сярод якіх былі і паважаныя людзі, вядомыя пісьменнікі, напрыклад...

Сяргей ТРАЦЦЯК: У Беларусі ўжо з канца 1970-х — пачатку 80-х пачалі сур'ёзна гаварыць аб вяртанні даце 17 верасня статусу свята. Прычым гаварылі не выпадковыя людзі, ветэраны заходнебеларускага камуністычнага руху, той жа Максім Танк. Але мы па-ранейшаму сябравалі з Польшчай, якую «не трэба крыўдзіць»... Толькі ў 1989 годзе пытанне было вынесена на Пленум ЦК КПБ. Прапанаўвалася некалькі дат, у тым ліку 17 верасня і 28 кастрычніка (дата прыняцця Народным сходам Заходняй Беларусі дэкларацыі «Аб уладзе»). Але спыніліся на даце 14 лістапада — менавіта гэта дата найвышэйшым пасяджэнне у студзені 1990 года была прынята як Дзень уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Але максімум, што было, — гэта публікацыя ў газетах. Бо яшчэ быў СССР, дзейнічала ўсё тое ж негалоснае палякаў не злаваць. А пасля разваліўся Саюз, і каму было да апошніх пастаноў ЦК?

«ЗВЯЗДА»: Дый, падаецца, дата не вельмі ўдала была выбраная — людзі пра яе ўвогуле не ведалі.

Сяргей ТРАЦЦЯК: Юрыдычна яна была выбраная правільна: 14 лістапада 1939 года, з прыняццем Закона аб далучэнні Заходняй Беларусі да БССР, працэс уз'яднання быў афармлены канчаткова. Але далёка не заўсёды юрыдычна вывераная дата застаецца ў народнай памяці. 17 верасня ўсё толькі пачынаялася, але па абодва бакі былой мяжы гэты дзень застаўся ў памяці як дзень вызвалення... А з 1992 года 14 лістапада ў спісе памятных і святочных дат Рэспублікі Беларусь ужо не было.

«ЗВЯЗДА»: Зноў не хацелі «крыўдзіць палякаў» — ужо з іншых меркаванняў?

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ: Тады кіраваліся прынцыпам: усё савецкае — гэта дрэнна. Ды і вялізным было жаданне падабацца захаду...

«ЗВЯЗДА»: У сённяшніх міжнародных стасунках абвяшчэнне Днём народнага адзінства менавіта 17 верасня многімі разглядаецца найперш як палітычны крок...

Вадзім ЛАКІЗА: Калі прымалася рашэнне аб прапанове даты Дня народнага адзінства, гаварылі пра 17 верасня або 14 лістапада, і сярод экспертаў гучала думка: маўляў, мы катосьці пакрыўдзім. Але мы не павінны аглядацца на катосьці, мы павінны адстойваць свае нацыянальныя інтарэсы і падаваць гісторыю з пункту гледжання беларусаў, а не катосьці з суседзяў.

Тым больш у нас для аргументацыі напрацаваны велізарны матэрыял. Сёлета Інстытут гісторыі і Акадэмія кіравання правялі канферэнцыю, прысвечаную 100-годдзю Рыжскага міру, прычым не толькі на сваіх пляцоўках, але і ў іншых ВНУ. У 2019-м ладзілі навуковую канферэнцыю, прымеркаваную да 80-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі і БССР, вынікам якой стаў падрыхтаваны зборнік матэрыялаў «Назаўжды разам»... Вельмі важна, што заразі дзяржава ўзмацніла практычную работу. Існуе свайго роду дзяржзаказ на папулярызацыю падобных матэрыялаў...

Зразумела, што нашы аднаменты факты успрымуць па-свойму. Мы гады тры таму праводзілі міжнародную канферэнцыю па геапалітыцы, на якую прыехалі ў тым ліку і палякі. Калі гаварыць пра 1939 год — з дакументальна даказанымі фактамі, — польскі гісторык, якога звання гісторыка вымагае ацэньвадь рэчаіснасць аб'ектыўна, на гэтых фактах грунтуючыся, катэгарычна заявіў: «Мы ў Польшчы ніколі не пагодзімся з тым, што 17 верасня адбыўся акт гістарычнай справядлівасці»... Яны адстойваюць свае нацыянальныя інтарэсы, нават ігнаруючы факты. Чаму ж мы павінны сарамецца адстойваць свае?

Дзевяць з паловай мільёна чалавек, якія жывуць у нашай краіне, не могуць думаць адноўкава, гэтага і не трэба. Але ёсць нейкія базавыя рэчы, паняцці, якія аб'ядноўваюць людзей з рознымі меркаваннямі, і дата 17 верасня можа стаць адным з такіх аб'ядналных фактараў.

Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ: Палітычныя падзеі, якія адбываюцца зараз вакол нашай краіны, пацвярджаюць: хопіць клапаціцца, каб хоць каго не пакрыўдзіць, а трэба найперш дбаць пра ўласныя інтарэсы. І крок, зроблены кіраўніцтвам нашай краіны, — абвяшчэнне менавіта даты 17 верасня Днём народнага адзінства — вельмі важны і знакавы. Я, напрыклад, як гісторык, не ведаю лепшай, чым гэта, даты для дня з такім азначэннем. Можна спрабаваць штосьці прыцягнуць са старажытнасці. Але тут маем рэальны працэс — пачатак канчаткова ўз'яднання народа ў сваёй дзяржаве. Мы павінны паказваць і самім сабе, і міжнародай супольнасці, што для нас гэта дата звязаная з гістарычнай справядлівасцю. Для катосьці, можа, наадварот, але ж мы — беларусы, бачым і разумеем гісторыю з нашых беларускіх пазіцый. Мы нікому не прад'яўляем прэтэнзій, мы проста захоўваем гістарычную памяць уласнага народа.

Круглы стол правяла Алена ЛЯЎКОВІЧ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Алена ПАПОВА:

«Ёсць слаі жыцця, нашмат больш глыбокія, чым любое ўяўленне»

«Тэатр, як вядома, мае звычай зацягваць у сябе людзей, як зачараваны лес». Думаецца, праўдзівасць гэтага радка з рамана «Вялікае падарожжа Малой» пацвердзіць аўтарка Алена Папова. Ведаюць яе не толькі як драматурга, чые п'есы ідуць па ўсім свеце, перамагаюць на прэстыжных міжнародных конкурсах, але і як адметнага празаіка. «Таямнічы код прозы Алены Паповай» — гучала ў загалоўку адной з рэцэнзій.
Мы сустрэліся з Аленай Георгіеўнай, каб абмеркаваць таямнічыя коды жыцця і літаратуры.

— Ці заўсёды аўтар можа прадказаць лёс сваіх твораў?

— Вельмі цяжка прадказаць. Тым больш цяпер. Грамадства яшчэ не асэнсавала новую інфармацыйную рэальнасць, усё ў ёй перамяшана. Камерцыйнае мастацтва, высокае... У «Цік-току» ў хлопчыка, у якога зместу ролікаў — «два прытопы, два прыхлопы» — восем мільёнаў падпісчыкаў. І пры гэтым я са здзіўленнем даведваюся, што мае п'есы актыўна ставяцца ў дзясятках маладзёжных студый... Значыць, з некім супадаю.

— Можна супаставіць, як падчас перабудовы на рынак хлынула плынь масавай літаратуры, раней недаступнай, — і мы разгубіліся... Не адразу пачалі фільтраваць, што сапраўды вартае. Бо ўсё, што не сацрэалізм, не пра заводы і калгасы, — ужо было добра.

— Але тады адкрыліся шлюзы і для такой літаратуры, як Гросман, Рыбакоў... Не лічу, што гэта шэдэўры, але свядомасць яны мянялі. Проста мы дасюль знаходзімся ў эпосе перамен. Нічога яшчэ не вызначана, можна арыентавацца толькі на ўласны густ. Напрыклад, чую: «вялікі Салжаніцын»... Ён не вялікі пісьменнік, пры ўсёй павазе. Трыбун, магутная асоба... Маштаб ахопу, суперажыванне чалавечай пакуце... У выніку моцная кніга, кепска напісаная. Бо літаратура — гэта ўсё-ткі феномен мовы і стылю. Гэта нешта іншае, чым публіцыстыка і нават мастацкае эсэ. Пад'ём над светам на больш метафарычным, метафізічным, філасофскім узроўні.

— Вы верыце ў гамбургскі рахунак у літаратуры?

— Вядома! А як іначай? Усё павінна стаяць на сваіх месцах... Людзі ўсё-ткі жыццё аддавалі, крывёй плацілі за тое, каб ствараць... У нас вельмі мала крытыкі, мала чытача. І чытачу ў асноўным трэба нешта простага ўзроўню: прыгоды, жаночыя раманы. Калі б зараз з'явіўся Кафка ці Пруст, наколькі б ён быў папулярны? Цяжка знайсці свой голас. Ёсць сапраўды адораныя людзі, якія, з аднаго боку, хочуць выказаць сябе, а з іншага — хочуць і неяк трапіць у танальнасць свету, і прымаюць правілы гульні. Згадаць таго ж Сарокіна, блюсцячага стыліста, Пялевіна... Я добра стаўлюся да «паўпасоў», той жа Акунін цудоўна зрабіў свой праект... Але гэта праект. Я ніколі не скажу, што гэта літаратура ў маім разуменні гэтага слова.

— Стварыць пазнавальны літаратурны вобраз, як удалося Акуніну, — вялікая ўдача.

— Так, гэта няблага. Таму не магу сказаць, што, напрыклад, да Роўлінг трэба ставіцца паблажліва. Яна навучыла дзяцей па ўсім свеце чытаць, у яе цудоўная фантазія... Але Толкіен для мяне больш буйная фігура. Увогуле, прасцей гаварыць пра літаратуру мінулага — пра сучасную пакуль рана. Адзін немец-філолаг сказаў мне: «Вы ведаеце, зараз столькі пішуць у Германіі і такая колькасць кніг выходзіць, што мы пакуль не разабраліся». А ўяўляеце — у машынах свету? Ёсць спецыялісты, але яны тэндэнцыйныя. Усе падзеленыя: вы за тых, вы за гэтых... А мяне цікавіць толькі адно: чаго варта напісанае? Я дарую ўсё аўтару... Калі гэта літаратура. Бачу ў пастках пісьменнікаў на «Фэйсбуку» іх разгубленасць... Усё-ткі я вельмі шмат гадоў займаўся тэатрам і разумею стан чалавека нават па яго інтанацыі. Літаратура сышла з першых месцаў у свядомасці грамадства. І людзі, якія яшчэ нядаўна валодалі вялікай аўдыторыяй, адчуваюць, што яны сцяліся, скурчыліся. І гэта я кажу аб знакавых імёнах.

— Чытач, які вырас на блогах, не ведае, як атрымляюць асалоду ад самога стылю — яму патрэбны захапляльны сюжэт...

— Валодаць майстэрствам пабудовы сюжэта — найвышэйшы пілатаж. Нават у Галівудзе не ўсе гэта ўмеюць. Кепска, што ўпаў прэстыж літаратуры. Цяпер працуюць у ёй адзінкі. Хоць не магу сказаць, што нікога вартага не засталося. Павел Пражко ў драматургіі добра працуе, хоць нават фестывалі яго імя ладзяць, спадзяюся, пяройдзе на прозу. Дасылаў ён мне некалі свае апавяданні, вельмі цікава, ёсць пачуццё слова.

— Ці лёгка перастройвацца з драматургіі на прозу і наадварот, ці гэта паралельныя рэйкі?

— Цяжка сказаць... Напэўна, усё-ткі пераключаеш нейкую танальнасць. Проза — гэта больш свабоды. Часам проста нейкая самнамбулія...

— Бывае, што пачынаеце пісаць, а героі звоздзяць сюжэт у нечаканы для вас бок?

— Заўсёды. Гэта самае цікавае. Гэта як падарожжа. Ведаю, здараецца і па-іншаму... Асабліва ў мужчын-літаратараў. Мужчыны — зануды. У іх часам не проста планы, — у іх літаральна сетка будучага твора, дзе ўсё падрабязна распісана. Божа, мяне б ніхто не змусіў гэтыя дровы сячы... Цікава, калі ты не ведаеш, што будзе далей.

— Плачаце над сваімі п'есамі, калі пішаце?

— Рэгулярна. Абавязкова ў канцы ў мяне ўвесь час пачынаюць рыданні. А Максім Горкі губляў прытомнасць, такі здаровы мужык з Волгі... Ну, ён увогуле быў уразлівы.

— Ды яшчэ нібыта, калі апісваў, як яго героя забіваюць нажом, на агоньом целе з'явіўся след ад таго віртуальнага нажа.

— Ну, гэта хутчэй прыдумана... Але падобнае магчыма. Я ў гэта веру. Я, канешне, не люблю «возвышенных кретинов», пра якіх Пісараў пісаў, што не менш нешта такое... містычнае ў працы пісьменніка ёсць. Напрыклад, вось у вас бывае нянавісць да чыстага аркушаў? У мяне бывае. Праз сілу падыходзіш да стала...

— Гэта нармальна — прымушаць сябе пісаць?

— Нармальна. Як рассаджвай Макаёнак, жонка Шамякіна, каб змусіць мужа пісаць, давала таму ежу і замыкала ў кабінеце.

— Ну, у той час напісанае было сродкам да існавання ўсёй сям'і. А сёння — хобі, за якое не плацяць.

— Усё адно, праца празаіка — гэта праца, якую трэба выседзець. Леў Талстой колькі разоў перапісваў «Вайну і мір»? У Дастаеўскага на гэта не было часу, ну дык у яго і які ж тэкст каструбаваты.

— На гэты конт я кажу студэнтам: перайміць вялікіх бескарысна, бо ў іх недахопы зрабіліся адметнасцямі...

— Так, адзінае, што можна параіць сёння маладому аўтару, — гаварыць свайм голасам. На полі мастацтва можна быць дастаткова вольным. Ёсць слаі жыцця нашмат больш глыбокія, чым любое ўяўленне. Бездань чалавечая. Савецкая цэнзура — вось калі перашкаджалі. Для мяне мастацкая рада — гэта была такая мігрэнь... Дзве гадзіны памяраеш. Часам былі шыкоўныя мастацкія рады... Толькі п'есу пасля не ставілі. У любых варунках застаецца мова вобраза, мова падтэксту... Мастак заўсёды мова выказаць тое, што ён хоча.

— І ўсё гэта майстэрства можа аказацца бескарысным, бо людзі ядуцца на тое, што не трэба расшыфроўваць. Сёння ў шоу-бізнесе мода на фрыкаў, на тых, хто здольны на такую шчырасць, якая раней, можа, успрынялася б як дурасць.

— Я ўжо згадвала хлопчыка-ціктокера, у якога восем мільёнаў падпісчыкаў... Яго завуць Даня Мілохін. Ён разбагацеў у сямнаццаць гадоў. Зусім неадказаваны. Рос у дзіцячым доме, прыёмных бацькі вельмі простыя. Дробныя рысы твару, раскаваны... Не скажаш, каб артыстызм... Дае грошы прыёмнаму бацьку на бізнес, апранаецца ў шыкоўныя брэндавыя рэчы... Ён быў ва Урганта на перадачы. Выйшаў: «Я вось тут сядзеў, вас слухаў, вы там нешта нібыта дасцінічалі, але ж гэта не смешна!» І Ургант зніжаваў. Я сустракаюся з тым, што баяцца людзі моладзі... Калі дзіця з трох гадоў лепш разбіраецца ў мабільніку, чым яго маці, у яе з'яўляецца страх перад незразумелым. Але, думаю, пройдзе гадоў дваццаць, і ўсё ўсталюецца. Бо, па сутнасці, нічога не мяняецца пад месяцам. Але ёсць законы замбіравання натоўпу. Выйдзе раней абвяшчальнік на плошчу: «Чума ў горадзе!», і ўсе пачынаюць бегаць, як курыцы... А зараз дастаткова пусціць інфармацыю ў сацсетках.

— Расійскі пісьменнік Іваноў даўно прадказаў у рамане «Кам'юніці» наша існаванне ў сацыяльных сетках, калі кожны ў сваім коле зносін, дзе адмыслова падбіраюцца навіны, і кожнаму здаецца, што гэта і ёсць сапраўдны свет... Хоць паралельна ў іншых кам'юніці зусім іншы светапогляд, іншыя навіны... Абмежаванне пры ўвядзенні бязмежнасці інфармацыйнай прасторы. У рамане, дарэчы, з інтэрнэту з'яўляецца персаніфікаваная Чума...

— Я рэдка зазіраю ў сацыяльныя сеткі — але гэта цікава: людзі вельмі выдаюць праз выказванні характар. Але я не сумняваюся, што там хтосьці заўсёды незаўважна кіруе меркаваннямі. І гэта мяне стрымлівала шмат гадоў ад завядзення ў інтэрнэце. Намацаюць у цябе нейкія падважнікі, на якія можна ціснуць... Страшна.

— А ў вас было, што напісалі нешта ў творы, а яно збылося?

— Вельмі часта. Ды вось у мяне ёсць п'еса «Плошча Перамогі», напісаная ў 1975 годзе. Праз трыццаць гадоў узнік Бессмяротны полк, які там апісаны. Яшчэ ў мяне быў вобраз — савецкая краіна затанула, як Атлантыда... Прайшло дваццаць гадоў, і гэты вобраз сустракаю паўсюль.

— У вас нетыповая біяграфія для беларускага пісьменніка... Вы нарадзіліся ў польскім Лагцы ў сям'і ваеннага журналіста...

— Так. Бацька быў на фронце, а пакольскі пісаў, у канцы вайны яго ўзялі ў газету. Стаў пісьменнікам, перакладчыкам. Маё дзяцінства прайшло ў доме каля опернага тэатра. А ўжо з маіх чатырнаццаці гадоў мы пасяліліся ў доме, дзе ў адным пад'ездзе з намі жылі Язэп Пушча, Уладзімір Караткевіч, Вячаслаў Адамчык...

— Ваш шлях быў прадвызначаны?

— Магчыма. Я заўсёды імкнулася да тэатра. Пайшла ў легендарную студыю «Юнацтва» на базе Мінскага клуба чыгуначнікаў імя Ільіча пад кіраўніцтвам Уладзіміра Балабохіна. Там былі будучыя вядомыя артысты Мікалай Кірычэнка, Уладзімір Матросаў, Валерый Шушкевіч... Напэўна, і я актрысай магла б быць. Але такой... Не зоркай.

— Каго іграла?

— Карміліцу ў «Антыгоне» Ануя, Сакратаршу ў «Лазні» Маякоўскага... Адолела нават першы тур у маскоўскім тэатральным вучылішчы... Але паступіць не наважылася. Не. Тэта вельмі цяжкі лёс. Залежны. Я помню, як мой першы спектакль «Хуткія цягнікі», ставіў Валерый Раеўскі ў Віцебску. Дарэчы, вельмі добры спектакль, шкада, запісы не захаваліся. Я была зусім маладая, яшчэ не ступіла ў Саюз пісьменнікаў. А Раеўскі толькі што прыехаў з Лондана... І вось ён сядзіць з некім, і яны абмяркоўваюць актрыс. Як коней. Ногі каратаквацыя, постаць не такая... Гэта для мяне запомнілася як жах. Пры гэтым Раеўскі быў вельмі інтэлігентны, таленавіты. Я гэта прызнала, хоць з Масквы, дзе вучылася ў Літаратурным інстытуце, прыехала снобкай — у мяне ж сувязі ў маскоўскіх тэатрах, знаёмства з Эфрасам...

— Эфрас ставіў вашы п'есы?

— Не. Але ён прачытаў маю п'есу, яна яму спадабалася. Я сустракалася з ім некалькі разоў, прыходзіла да яго ў тэатр на Малой Броннай, які быў каля Літінстытута. І я не чакала, што Раеўскі — я бачылася з ім у Маскве, калі ён у Любімава працаваў, — нашмат больш тонкі, чым мне здаваўся.

— У Літінстытут вы паступалі менавіта на драматургію?

— Напачатку паступіла на прозу. Набіраў Залыгін, у яго быў кірунак народніцкі такі. Мяне ўзялі на завочнае аддзяленне. А Макаёнак дапамог пасля перавесціся на вочнае і на драматургію. Андрэя Макаёнка вельмі добра ўспамінаю. Пражыў не так ужо шмат, шэсцьдзясят адзін год. Ён вельмі баяўся смерці. Нават запавет не мог напісаць. Казаў: «Я не магу напісаць слова «смерць». Ён не проста так узяў за жонку Ірача. Гэта такое пакаленне... Больш шчырае. Франтавікі. Людзі, якія да трагедый жыцця былі блізкія. І калі ім Бог паслаў дабрабыт, яны да яго ставіліся іначай, чым мы.

— А ў вас ёсць тое, пра што вы баяліся пісаць?

— Напэўна... Бо заўсёды страшна наклікаць бяду. Помню, чытаю апавяданне адной маскоўскай дамы — як маленькае дзіця пайшло і заблукала ў стэпе, і яна пакуты гора смакуе... І я адразу падумала: ну, напэўна, у яе сваіх дзяцей не было. Таму што ёсць нейкія рэчы, якія вельмі цяжка жанчыне перастуліць. Калі ўсё ад галавы — нястрашна, можна прадумаць, і гэта не паўплывае ні на што. А калі ёсць душэўная сувязь з тым, што пішаш... Раптам закранеш нейкія стыхіі? Я, напрыклад, баюся камусьці пажадаць дрэнната. Хоць часам хацелася б. Жыццё такое... крохкае. Як пішуць на помніках: не ганарыся, мінак. Мы самі не валодаем сваім лёсам, трэба быць асцярожнымі.

Людміла РУБЛЁЎСКАЯ.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Агульная памяць

СКРОЗЬ АГОНЬ

Мы абавязаны змагацца за праўду пра вайну

У Выдавецкім доме «Звязда» пры падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі пабачыў свет альбом «Подзвіг савецкага народа бессмяротны: новыя экспазіцыі «Брэсцкай крэпасці-героя» і Музея Перамогі на Паклоннай гары ў Маскве: да 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны».

Лаканічнае выданне бачыцца выключна значнай падзеяй не толькі ў плане расповеду пра Вялікую Айчынную вайну, яе пачатак, пра першыя дні драматычнага перыяду абароны Савецкай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пра іншыя этапы самай жахлівай вайны ў свеце. Кніга-альбом паказвае характар, сучасны ўзровень музейных магчымасцяў у захаванні гістарычнай памяці, розных экспанатаў і розных музейных рэканструкцый дзеля патрыятычнага выхавання грамадства. Дзеля таго, каб пераканаць увесь свет, пакаленні людзей, якія не бачылі Вялікую Айчынную на свае вочы, што неверагодная сілы мужнасць тых, хто аб'яднаў у адным клопаце, у адной справе з мэтай перамагчы ворага, перамагчы люты фашызм, дазволіла прайсці праз выпрабаванні, нанесці ўдар па Германіі і яе сатэлітах, яе прыспешніках, па ўсіх тых, хто ішоў на нашых прашчураў у несправядлівым паходзе са злодзейскімі мэтамі.

У гэтыя музеі — і ў мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» (быў адкрыты 25 верасня 1971 года) і ў «Музей Перамогі» (Цэнтральны музей Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.) у Маскве (найбуйнейшы ў Расіі музейны комплекс, прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне, адкрыты 9 мая 1995 года), — прыходзяць тысячы і тысячы людзей з Беларусі і Расіі, з усіх постсавецкіх прастораў, з усяго свету. Прыходзяць, каб сэрцам, душою дакрануцца да памяці, каб адчуць гарачае полымя неймаверна складанай барацьбы. Прыходзяць дзеці, унукі, праўнукі, прапраўнукі, часам — рэдкія, адзінокія сведкі далёкіх падзей. Тут, у сценах крэпасці і ў маскоўскіх музейных залах, плачуць, змахваюць слязу, адчуваюць боль у сэрцы. Сюды прыходзяць, каб спасцігнуць усю праўду, дарослыя і дзеці... На адной з першых старонак кнігі — словы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі з яго выступлення на цырымоніі ўскладання вянкоў да манумента Перамогі экспазіцыям ваенна-гістарычных музеяў Беларусі і Расіі, — у памяць, у тыя даўнія драматычныя падзеі. І вы знойдзеце — пра самыя розныя артэфакты, выкладзеныя беларускімі і расійскімі музейшчыкамі, выразна пракаментаваныя імі, сведчанні болю і мужнасці, трагедыйнасці жахлівага ваеннага жыцця і выключнага гераізму. Чытаем пад адным з экспанатаў: «Будзільнік, знойдзены пасля вайны на тэрыторыі Цярэспальскага ўмацавання, сумна вядомы на ўвесь свет. Ён спыніўся ў тое імгненне, калі на крэпасць былі скінуты першыя фашысцкія снарады. Гадзіннік адлюстраваў імгненне, у якім жыццё мільёнаў людзей раздзялілася на «перад» і «пасля». Вось у імя гэтага «пасля», відавочна, і варта ствараць такія праекты, якія ініцыіраваў Пастаянны камітэт Саюзнай Дзяржавы на чале з Дзяржаўным сакратаром Дзмітрыем Мезенцавым. Трэба нагадаць, што ў свае гутаркі, на сустрэчах перш-наперш з журналістамі і раней Дзмітрый Фёдаравіч акрэслена гаварыў пра ролю Вялікай Айчыннай вайны, месца памяці пра яе ў фарміраванні характару, свядомасці нашых народаў, у вызначэнні агульных прыярытэтаў гуманістычнага развіцця грамадства ў Расіі і Беларусі.

Выступаючы на ваенным парадзе ў азнаменаванне 76-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін (і гэтыя словы ўвайшлі ў кнігу-альбом) зазначыў: «У гэтым годзе спаўняецца 80 гадоў з пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Адказам на ўварванне нацысцкіх полчышчаў стала агульнае, грознае, непераадольнае пачуццё рашучасці адбіць нашэсце. Зрабіць усё, каб вораг быў пераможаны, каб злачынцы, забойцы панеслі непазбежнае і справядлівае пакаранне.

Савецкі народ выканаў гэтую святую клятву, адстаяў Радзіму і вызваліў краіны Еўропы ад карычневай чумы. Вынес нацызму гістарычны прысуд і магутнасцю зброі на палях бітваў, і сілай сваёй маральнай, чалавечай слушнасці, ахвярнай мужнасці салдацкіх маці, вернасцю тых, хто кожны дзень чакаў ад родных лістоў з фронту.

Гісторыя патрабуе рабіць высновы і здабываць урокі. Але, на жаль, шмат што з ідэалогіі нацыстаў, тых, хто апантаны вар'яцкай тэорыяй пра сваю выключнасць, ізноў спрабуюць паставіць на ўзбраенне. Расія паслядоўна адстойвае міжнародныя правы, пры гэтым мы будзем цвёрда абараняць нашы нацыянальныя інтарэсы, забяспечваць бяспеку нашага народа. Надзейныя гарантыі гэтаму — доблесныя Узброеныя сілы Расіі, нашчадкі салдат Перамогі...»

Тэксты да кнігі-альбома «Подзвіг савецкага народа бессмяротны: новыя экспазіцыі «Брэсцкай крэпасці-героя» і Музея Перамогі на Паклоннай гары ў Маскве: да 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны», першая прэзентацыя якой адбудзецца 21 чэрвеня 2021 года ў Брэсце, напісалі Л. Бібік і С. Любянкова. У рэдакцыйны савет выдання ўвайшлі вядомыя арганізатары музейнай справы, скіраваныя на захаванне ваеннай памяці, — дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Р. Высюк, дырэктар Музея Перамогі А. Школьнік, іх намеснікі — Л. Бібік, С. Любянкова. У кнігу ўвайшлі фотаздымкі, зробленыя Алегам Палешчуком і Андрэем Лебедзевым. Да работы над альбомам спрычыніліся і іншыя рупліўцы. Поруч з супрацоўнікамі Выдавецкага дома «Звязда», Паліграфічнага камбіната імя Якуба Коласа шмат намаганняў для таго, каб праект здзейсніўся, прыклалі кіраўнікі, супрацоўнікі Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы на чале з Дзяржаўным сакратаром Дзмітрыем Мезенцавым.

Кніга-альбом, якая ўжо сама па сабе з'яўляецца добрым урокам патрыятычнага выхавання, прыйдзе ў розныя бібліятэкі Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, не выключана, што яна трапіць і ў агульнаадукацыйныя школы. І самае істотнае, важнае тое, што яна павінна спрабаваць актыўны працяг работы па пашырэнні вядомасці пра многія і многія экспанаты ваенна-гістарычнай памяці. Кнігі, альбомы такога кшталту, падрыхтаваныя чуйнымі, уважлівымі спецыялістамі, дазволяць разгарнуць новыя абсягі ў справе захавання сапраўднай гісторыі пра Вялікую Айчынную вайну 1941—1945 гадоў, пра яе ўдзельнікаў, якія не шкадавалі сваіх жыццяў у імя светлай, мірнай будучыні наступных пакаленняў, нас з вамі. І мы, нашчадкі, ім абавязаны...

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

Вернісаж

ІРАНІЧНАЯ ФАНТАСМАГОРЫЯ ВАЛЯНЦІНА ГУБАРАВА

Фота Яна ХВЕДЧЫНА

Напэўна, мала на якіх выставах людзі так шмат усміхаюцца... І мала каго з мастакоў гэтак адразу пазнаюць па стылі. Іронія, гратэск, гумар, настальгія... І любоў да звычайнага чалавека, які заслугоўвае шчасця. Смешныя, амаль карыкатурныя фігуркі, пазнавальныя сітуацыі і дэталі побыту... Савецкія інтэр'еры з алоэ і фікусамі на падаконніках, дворыкі, дзе сушыцца на вяроўках бялізна, персанажы ў штанах-трэніках і ватоўках, якія мараць і сумуюць і могуць нават узляцець над горадам, казачныя каты, што здольныя замест мройлівых распадароў заняцца гарадам, і яркія кветкі, якія раптам сталі вялікімі, як дом...

Валянціна Губарава некаторыя называюць «беларускім Брэйгелем», а яго манеру аднойчы параўналі з легендарным раманам Венечкі Ерафеева «Масква-Петушкі»... Мастак надзвычай запатрабаваны не толькі ў Беларусі — яго карціны знаходзяцца ў замежных музеях і галерэях, прадаюцца на сусветных аўкцыёнах. Нядзіўна, што на адкрыццё выставы «Вялікія мары маленькіх людзей. Валянцін Губараў» у Нацыянальным мастацкім музеі сабраліся, нягледзячы на пандэмію, сотні прыхільнікаў. Тым больш падчас адкрыцця адбылася прэзентацыя новага мастацкага альбома мастака, які пабачыў свет у выдавецтве «Чатыры чвэрці». Чарга за аўтографамі стаяла, як падчас прэзентацыі літаратурнага бестселера, гадзіны, мусіць, паўтары.

На выставе прадстаўлена 50 жывапісных палотнаў, якія змясцілі не толькі ўсміхнуцца, але і задумацца над сэнсам быцця.

— Творчасць Губарава — дзіўны феномен, — сцвярджае **вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага мастацкага музея, мастацтвазнаўца Надзея УСАВА.** — Мастак — невычарпальны фантазёр. Здзіўляе, як ён бясконца прыдумляе свае сюжэты, адценні настрою, якія зразумелыя і навукоўцу, і бульдазерысту. Дарэчы, зараз паралельна ў нас праходзіць выстава «Макоўскія» да 175-годдзя вядомага рускага мастака Уладзіміра Макоўскага. Таксама пісаў побыт, толькі XIX стагоддзя. Раю прыйсці і параўнаць з тым, што стварае Валянцін Губараў пра побыт XX стагоддзя. Чым прывабліваюць карціны Губарава? Іроніяй і самаіроніяй і ў той жа час сумам аб родзе чалавечым, нязлой усмешкай: «Ну што ж нароблш — людзі такія. Перарабіць немагчыма — трэба любіць іх такімі». На яго палотнах гэтыя простыя людзі сумуюць, тужаць невядома аб чым... Мастак глядзіць на іх з дабрадушным спачуваннем. Там ёсць яшчэ і дзіцячая скіпнасць да разглядання, разгадвання загадак і завязвання гісторый. На кожным малюнку можна стварыць гісторыю, і кожны можа прыдумаць сваю. Ёсць там і сур'ёзныя падтэксты, і шчыльны эмоцыі.

Выстава прадоўжыцца да 18 ліпеня. Калі наведаеце, абавязкова звярніце ўвагу на карціну, якую Валянцін Губараў напісаў адмыслова для галоўнага мастацкага музея краіны — на ёй у непарадыальнай губаравскай манеры адлюстраваны будынак Нацыянальнага мастацкага музея.

Людміла РУБЛЁЎСКАЯ.

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

Консолидированный отчет о финансовом положении на 31 декабря 2020 г.

(в тысячах белорусских рублей)

	Прим.	2020 г.	2019 г.
Активы			
Денежные средства и их эквиваленты	6	836 947	809 633
Драгоценные металлы		21	158
Средства в кредитных организациях	7	53 957	65 423
Производные финансовые активы	8	32	73
Кредиты клиентам	9	3 543 672	3 410 592
Инвестиционные ценные бумаги	10	518 687	415 390
Инвестиции в ассоциированные и совместно контролируемые компании	11	2 546	5 257
Основные средства	12	53 599	51 761
Активы в форме права пользования	13	10 405	4 559
Нематериальные активы	14	40 520	41 620
Текущий актив по налогу на прибыль		436	654
Прочие активы	17	32 232	30 852
Итого активы		**5 093 054**	**4 835 972**
Обязательства			
Средства кредитных организаций	18	1 408 298	1 293 375
Задолженность перед Национальным банком Республики Беларусь	19	26	21
Производные финансовые обязательства	8	7 860	1 258
Средства клиентов	20	2 600 298	2 541 000
Выпущенные долговые ценные бумаги	21	78 457	46 767
Обязательства по договорам аренды		11 853	4 195
Текущие обязательства по налогу на прибыль		155	3 643
Отложенные обязательства по налогу на прибыль	15	16 918	18 304
Прочие обязательства и резервы	17	57 956	55 918
Субординированные займы	22	257 467	212 600
Итого обязательства		**4 439 288**	**4 177 081**
Капитал			
Уставный капитал	23	473 057	473 057
Эмиссионный доход		458	458
Дополнительный капитал		5 485	5 485
Фонд переоценки зданий		2 479	2 502
Фонд переоценки ценных бумаг		(2 732)	15 617
Нераспределенная прибыль		175 019	161 772
Итого капитал, приходящийся на акционеров Банка		**653 766**	**658 891**
Итого капитал		**653 766**	**658 891**
Итого капитал и обязательства		**5 093 054**	**4 835 972**

Консолидированный отчет о прибыли или убытке за год, закончившийся 31 декабря 2020 г.

(в тысячах белорусских рублей)

	Прим.	2020 г.	2019 г.
Процентная выручка, рассчитанная с использованием эффективной процентной ставки			
Кредиты клиентам		287 173	256 183
Инвестиционные ценные бумаги		35 282	45 875
Средства в кредитных организациях		5 679	4 698
		328 134	**306 756**
Прочая процентная выручка		**5 788**	**–**
Процентные расходы			
Средства кредитных организаций		(49 365)	(48 914)
Средства клиентов		(77 409)	(67 190)
Субординированный кредит		(15 772)	(14 821)
Процентные расходы по договорам аренды		(187)	(111)
Выпущенные долговые ценные бумаги		(5 024)	(4 712)
		(147 757)	**(135 748)**
Чистый процентный доход		**186 165**	**171 008**
(Создание)/восстановление резервов по кредитным убыткам	16	(86 751)	2 892
Чистые доходы/(расходы) от модификации кредитов	9	17	(101)
Чистый процентный доход после (создания)/ восстановления резервов по кредитным убыткам		**99 431**	**173 799**
Чистые доходы/(расходы) от первоначального признания финансовых инструментов, по которым начисляются проценты		3 760	(10 423)
Чистые комиссионные доходы	25	65 605	63 055
Чистые расходы по кредитам клиентам, оцениваемым по справедливой стоимости через прибыль или убыток		(727)	
Чистые доходы по операциям с инвестиционными финансовыми активами, переоцениваемыми по справедливой стоимости через прочий совокупный доход		826	–
Чистые доходы/(расходы) по операциям в иностранной валюте:			
- торговые операции		28 455	25 048
- операции с валютными производными финансовыми инструментами		(31 289)	1 135
- переоценка валютных статей		(4 553)	(17 229)
Доля в убытке ассоциированных и совместно контролируемых компаний	11	(2 711)	(487)
(Создание)/восстановление резервов по кредитным убыткам по прочим финансовым активам и условным обязательствам кредитного характера	16	(10 814)	8 089
Прочие доходы	26	42 955	70 823
Непроцентные доходы		**91 507**	**140 011**
Расходы на персонал	27	(68 522)	(73 085)
Амортизация	12, 13, 14	(27 739)	(25 008)
Налоги кроме налога на прибыль		(3 628)	(3 120)
Прочие операционные расходы	27	(76 111)	(70 819)
Непроцентные расходы		**(176 000)**	**(172 032)**
Прибыль до расходов по налогу на прибыль		**14 938**	**141 778**
Расходы по налогу на прибыль	15	(1 714)	(25 071)
Прибыль за отчетный год		**13 224**	**116 707**
Приходящаяся на:			
- акционеров Банка		13 224	116 707
		13 224	**116 707**

Консолидированный отчет о совокупном доходе за год, закончившийся 31 декабря 2020 г.

(в тысячах белорусских рублей)

	Прим.	2020 г.	2019 г.
Прибыль за год		**13 224**	**116 707**
Прочий совокупный (убыток)/доход			
Прочий совокупный доход, подлежащий переклассификации в состав прибыли или убытка в последующих периодах			
Чистая величина изменения справедливой стоимости долговых инструментов, оцениваемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход		(20 583)	6 982
Величина изменения оценочного резерва под ожидаемые кредитные убытки по долговым инструментам, оцениваемым по справедливой стоимости через прочий совокупный доход		3 060	(2 291)
Сумма накопленной прибыли, реклассифицированная в состав прибыли или убытка в результате выбытия долговых инструментов, оцениваемых по справедливой стоимости через прочий совокупный доход		(826)	–
Прочий совокупный (убыток)/доход за год		**(18 349)**	**4 691**
Итого совокупный (убыток)/доход за год		**(5 125)**	**121 398**
Приходящийся на:			
- акционеров Банка		(5 125)	121 398
		(5 125)	**121 398**

Консолидированный отчет об изменениях в капитале за год, закончившийся 31 декабря 2020 г.

